

# «ТРОХГАДЗІННАЯ ГРАНІЧНА ШЧЫРАЯ ГУТАРКА»

**Прэзідэнт Беларусі даў інтэрв'ю аднаму з найбольш вядомых сусветных выданняў**

(Стар. 2)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 ліпеня 2025 г. СУБОТА № 142 (30530)

КАМУНАЛЬНЫЯ СТАСУНКІ

# НАДЗЕЙНА І БЕСПЕРАБОЙНА

**Разбіраемся, ці гатовыя камунальнікі і газавікі да ацяпляльнага сезона**



«На свята думай пра будзень, а ўлетку пра зіму» — так гучыць народная мудрасць. І заклікае да прадбачлівасці і падрыхтоўкі да будучых халадоў у літаральным сэнсе. Карэспандэнт «Звязды» вырашыла даведацца, наколькі адказныя службы гатовыя да асенне-зімовага перыяду, які неўзабаве надыдзе.

СТАР. 7

НАШЫ ДЗЕЦІ — САМЫЯ ПРЫГОЖЫЯ

8-9



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

25142

ПА ПАЛІЧКАХ

# ПАДТРЫМКА НА СТАРЦЕ ПРАФЕСІЙНАЙ КАР'ЕРЫ

**У жніўні да працы прыступяць тысячы маладых спецыялістаў**



Прадастаўленне гарантаванага першага працоўнага месца — несумненная карысць для многіх выпускнікоў. Маладыя спецыялісты маюць як шэраг ільгот і прэферэнцый, так і шэраг абавязкаў перад дзяржавай. Дапамагчы разабрацца ва ўсіх тонкасцях заканадаўства ў адносінах да гэтай катэгорыі работнікаў «Звязда» папрасіла члена Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіла МІРОНЧЫКА.

СТАР. 5

# «ТРОХГАДЗІННАЯ ГРАНІЧНА ШЧЫРАЯ ГУТАРКА»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю аднаму з найбольш вядомых сусветных выданняў, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Назва СМІ, а таксама імя інтэрв'юера пакуль не раскрываюцца. Такая была просьба самога выдання — каб захаваць інтрыгу і эксклюзіўнасць матэрыяла.

Як расказала прэс-сакратар Прэзідэнта Беларусі Наталля Эйсмант, Аляксандр Лукашэнка размаўляў з журналістам больш за дзве з паловай гадзіны. «Гэта ў фармаце класічнага, скажам так, інтэрв'ю. Далей размова прадоўжылася ў фармаце off the record ("не пад запіс". — **«Зв.»**). Увогуле гэта была трохгадзінная гранічна шчырая гутарка. І шчырая, і змястоўная», — сказала яна.

У інтэрв'ю была закранута вялікая колькасць розных тэм. У ліку асноўных:

• Мірны працэс паміж Расіяй і Украінай: погляд на гэта Аляксандра Лукашэнкі і роля Беларусі.

• Беларуска-амерыканскія перагаворы: як пачыналіся, як прагрэсіруюць і чаго чакае ад іх Прэзідэнт.

• Палітыка шматвектарнасці: хто і як яе бачыць, за што крытыкуюць і ці адчувае Прэзідэнт занепакоенасць Расіі.

• Актыўны міжнародны дыялог Беларусі і санкцыі ў адносінах да краіны з боку ЗША і ЕС.

• Спецыяльная ваенная аперацыя: яе пачатак у дэталях.

• Беларуска-расійскія вучэнні «Захад-2025» і змяненне іх плана: з якой мэтай?

• Ядзерная зброя і ракетны комплекс «Арэшнік» як моцныя аргументы. Што наконт гэтага Прэзідэнту гаварылі амерыканцы?

• Суверэнітэт краіны і забеспячэнне яе бяспекі. Філасофскі і практычны погляды на фундаментальныя пытанні.

• Новы прэзідэнцкі тэрмін Аляксандра Лукашэнкі: ці будзе? І пра пераемніка: якога чалавека Прэзідэнт бачыць пасля сябе?

## СПЫТАЮЦЬ

Узмоцнена адказнасць старшынь райвыканкамаў за стратныя гаспадаркі і падзеж жывёлы.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 25 ліпеня падпісаў Указ № 290 «Аб узмацненні адказнасці старшынь райвыканкамаў», які вызначае падыходы для павышэння рэзультатыўнасці работы нізкаэфектыўных сельгасарганізацый, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Згодна з указам, для выхаду такіх арганізацый на прыбытковую работу аблвыканкамам даручана прымаць рашэнні аб замацаванні за старшынямі райвыканкамаў па адной стратнай сельгасарганізацыі. Размова ідзе аб гаспадарках, якія маюць за справаздачны год най-



# ШУКАЦЬ, ЗНАЙСЦІ І НЕ ЗДАВАЦЦА

## На што кіраўнік дзяржавы арыентуе нафтавікоў

Продкі навучылі беларусаў працаваць на зямлі. А навуковы прагрэс і сучасныя тэхналогіі дазволілі працаваць з тым, што знаходзіцца пад зямлёй. Гаспадарскі падыход і арыентацыя на максімальнае выкарыстанне «свайго» — такі прынцып Прэзідэнт «прывівае» ў развіцці розных сфер. У тым ліку, у галіне нафтаздабычы, тым больш, што рэзервы, а значыць, і перспектывы ёсць. На гэта Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка звяртаў увагу на нарадзе, якая прайшла ў гэты аўторак.

Да тэмы запасаў нафты і іх расапрацоўкі кіраўнік дзяржавы звяртаецца не ўпершыню. «Мяне інфармуюць, што на сёння прамысловыя запасы беларускай нафты складаюць каля 45 млн тон. За 2016—2023 гады яны прыраслі на 14 млн тон, у тым ліку толькі ў 2023 годзе — на 2,5 млн тон, што з'яўляецца рэкордам за апошнія 40 гадоў. Значыць, нешта ёсць. Яшчэ раз паўтараю: ідзіце і шукайце тое, што трэба краіне», — арыентаваў адказных Прэзідэнт на нарадзе аб стане і развіцці мінеральна-сыравіннай базы рэспублікі, нарошчванні геолагаразведачных работ, у тым ліку па вуглевадароднай сыравіне, яшчэ ў сакавіку 2024 года. Тады ж Аляксандр Лукашэнка назваў усе карысныя выкапні стратэгічным запасам, які належыць толькі народу. А паколькі цэны на карысныя выкапні і тым больш нафту з кожным годам растуць, не выкарыстоўваць шанец зарабіць яшчэ грошай і павысіць дабрабыт народа — недапушчальна.

Чаму трэба глядзець «углыб» зямлі і наколькі гэта важна для эканомікі краіны, растлумачылі і эксперты.

### НАФТА ЛЯГЧЭЙШАЯ, АЛЕ ЗДАБЫВАЦЬ ЯЕ ЦЯЖЭЙ



**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэту і фінансах, старшыня Беларускага дзяржаўнага канцэрна па нафце і хіміі Ілья ІКАН** расказаў, што за першае паўгоддзе 2025 года беларуская нафтаздабываючая галіна прадэманстравала ўпэўнены рост, павялічыўшы аб'ёмы на 4,5 %. І такі рост, па словах кіраўніка канцэрна, стаў магчымы дзякуючы прымяненню перадавых тэхналогій і вопыту спецыялістаў «Беларуснафты», якія адпавядаюць сусветным стандартам. «Выкарыстанне сучасных метадаў дазваляе не толькі эфектыўна здабываць нафту, але і пастаянна павялічваць аб'ёмы разведаных запасаў. Здабыча вуглевадароднай сыравіны — гэта не толькі ўклад у развіццё Гомельскай вобласці, дзе сканцэнтравана асноўная дзейнасць кампаніі, але і значны фактар для ўмацавання энергетычнай бяспекі ўсёй краіны. У бягучым годзе мы разлічваем здабыць крыху больш за 2 мільёны тон нафты», — паведаміў Ілья Ікан. Немалаважна, што беларуская нафта — добрай якасці. Напрыклад, яна лягчэйшая за расійскую, што дазваляе на выхадзе атрымліваць больш светлых нафтапрадуктаў, такіх як бензін і дызельнае паліва», — адзначыў ён. Гэта, у сваю чаргу, павышае эканамічную эфектыўнасць перапрацоўкі і дазваляе выпускаць прадукцыю з высокай дабаўленай вартасцю.

Павелічэнне здабычы і высокая якасць беларускай нафты ствараюць трывалую аснову для далейшага развіцця нафтаперапрацоўчай галіны краіны і ўмацавання яе пазіцый на ўнутраным і знешнім рынках. Далейшае ўкараненне інавацыйных тэхналогій і прыцягненне інвестыцый у разведку новых радовішчаў дазволяць забяспечыць стабільны рост здабычы. Ілья Ікан падкрэсліў, што гэты рост з'яўляецца не толькі пазітыўным сігналам для эканомікі, але і стымулам для далейшага развіцця айчыннай нафтаперапрацоўчай галіны. Павелічэнне попыту на паліва спрыяе павелічэнню аб'ёмаў вытворчасці, стварэнню новых рабочых месцаў і папаўненню дзяржаўнага бюджэту. «Белнафтахім» і ў далейшым будзе прыкладаць усе намаганні для стабільнага забеспячэння ўнутранага рынку якасным палівам па даступных цэнах, спрыяючы тым самым развіццю эканомікі і павышэнню якасці жыцця грамадзян Беларусі, — запэўніў Ілья Ікан.

### ВАЖНЫ СКЛАДНІК ЭНЕРГЕТЫЧНАЙ БЯСПЕКІ

Пра тое, што з нафты выпрацоўваюць розныя віды паліва, ведае кожны школьнік. Але нафта таксама выкарыстоўваецца для вытворчасці змазачных матэрыялаў, пластмас, сінтэтычнага каўчуку, растваральнікаў, лакаў, фарбаў, бітуму. Нават у касметалогіі і фармацэўтыцы прымяняюцца кампаненты, атрыманыя з нафты. Сапраўды, не проста так нафту называюць чорным золатам. На гэта звярнула ўвагу **Жанна ЧАРНЯЎСКАЯ, старшыня Пастаяннай камісіі па экалогіі і прыродакарыстанні Палаты прадстаўнікоў.**



«Нафта адыгрывае важную ролю ў эканоміцы краіны, надзвычай выгадная не толькі як паліва, але і як хімічная сыравіна. Нафта — гэта карысны выкапень, непаўторны ў сваім родзе. З нафты атрымліваюць паліва і многія іншыя прадукты, неабходныя сучаснаму грамадству. І яшчэ важны аспект — пасля перапрацоўкі нафты практычна не застаецца адходаў, так як усе яе складнікі выкарыстоўваюцца ў розных мэтах. Спецыялісты «Беларуснафты» эфектыўна здабываюць нафту з пастаянным прыростам як здабывальных, так і разведвальных аб'ёмаў. Сёння гэта добрая дапамога не толькі для Рэчыцкага раёна і Гомельскай вобласці, але і ў цэлым для краіны. І ўся наша нафта перапрацоўваецца на беларускіх НПЗ, — адзначыла парламентарый. — Спецыялісты гавораць аб Прыпяцкім прагібе як аб асноўным нафтаносным рэгіёне, які мае яшчэ як мінімум два перспектыўныя ўчасткі. Яны называюць Аршанскую і Падляска-Брэсцкую западзіны і паўднёвыя раёны Гомельскай вобласці. На гэтых тэрыторыях раней выконваліся здымачныя работы, геафізіка, бурыліся асобныя свідравіны. А з улікам новых тэхнічных магчымасцяў і кампетэнцый можна выконваць даразведку і маніторынг, у тым ліку ўжо наяўных свідравін. Больш дакладна ажыццяўляць расапрацоўку радовішчаў і свідравін, эфектыўна выкарыстоўваць, тым самым скарачаючы выдаткі». Жанна Чарняўская зрабіла акцэнт на тым, што ўласная сыравіна і іншыя рэсурсы з'яўляюцца залогам суверэнітэту і стабільнага развіцця эканомікі. «Гэта важны складнік энергетычнай бяспекі Беларусі, а таксама гэта сыравіна для вытворчасці экспартных тавараў з высокай дабаўленай вартасцю, што актуальна ў перыяд санкцыйнага ціску. І калі паглядзець на сусветны рынак нафты — зніжэнне цэн некалькі гадоў таму не вылілася ў масавае закрыццё праектаў па здабычы высоказатратнай нафты і не змагло прымусіць групу нафтаздабываючых краін знізіць вытворчасць нафты. А значыць попыт у свеце на нафту і яе прадукты стабільна ёсць», — дадала яна.

### СПРАШЧАЦЬ ГЭТУ ТЭМУ НЕ ВАРТА

Праблема ў тым, што большая частка запасаў беларускай нафты залягае вельмі глыбока. Самая глыбокая свідравіна — Прадрэчыцкая № 1 глыбінёй 6755 м. Для параўнання, напрыклад, у Расіі багатыя радовішчы залягаюць на глыбіні ад аднаго кіламетра. Але было б жаданне — і з прымяненнем сучасных тэхналогій, з разумна арганізаваным падыходам усё можна здабыць. А гэта яшчэ і развіццё навуковай школы ў той сферы, без якой сучаснаму чалавецтву не абысціся.



**Медыяэксперт Дзмітрый ШВАЙБА** ў эфіры ток-шоу «Будні» на «Альфа Радыё» заўважыў, што Беларусь мае вельмі сур'ёзныя кампетэнцыі ў частцы здабычы нафты. «Мы маем неабходныя тэхналогіі, абсталяванне, спецыялістаў. А гэта працэс складаны. Няма такога, што ледзь заглыбіўся — і там ужо нафта. Спрашчаць гэтую тэму не варта. Спецыялісты ведаюць, наколькі высокатэхналагічна ў Беларусі адбываюцца гэтыя працэсы, — адзначыў ён. — Адпрацоўваючы свае кампетэнцыі на тэрыторыі Беларусі, мы іх паспяхова прымяняем у Расійскай Федэрацыі. А тое, што кампетэнцыі сёння назапашаныя сур'ёзныя, — гэта відавочны факт». Эксперт падкрэсліў, што геолагаразведка — працэс нятанны, але неабходны: «Гэта мяжуе і з навукай, і з развіццём тэхналогій. Гэта і захаванне кампетэнцый унутры краіны. Таму што гэта настолькі ўнікальныя спецыялісты: на ўмоўным сусветным рынку такія спецыялісты будуць вельмі запатрабаваныя. Важна, што гэта беларусы, і што яны працуюць унутры краіны».

### ІНТЭНСІЎНАСЦЬ ПРАЦЫ ІСТОТНА ПАВЫСІЛАСЯ



Аб тым, які практычны вынік даюць сучасныя тэхналогіі нафтаздабычы лепей за ўсё раскажуць лічбы, якія прывёў **намеснік генеральнага дырэктара па вытворчасці «Беларуснафты» Дзяніс ВАРАБ'ЁЎ:** «У цяперашні час мы кратна скарацілі цыкл

## АСАБІСТА

большую страту ад рэалізацыі прадукцыі, тавараў (работ, паслуг) і не забяспечылі выкананне нарматыву тэхналагічных страт буйной рагатай жывёлы.

У выпадку паляпшэння вынікаў дзейнасці нізкаэфектыўнай арганізацыі, замацаванай за старшынёй райвыканкама, будзе прымацца рашэнне аб выплаце яму прэміі. А за невыкананне паказчыкаў не будзе ажыццяўляцца даплата за складанасць, напружанасць і інтэнсіўнасць працы, якая ўстаноўлена ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Акрамя таго, указ дае права губернатару па ўзгадненні з Прэзідэнтам і ў парадку, вызначаным заканадаўствам, перавесці старшыню райвыканкама на пасаду кіраўніка замацаванай за ім арганізацыі, якая не забяспечыла выкананне паказчыкаў.

будаўніцтва свідравіны. Калі раней такія аб'екты будаваліся прыкладна 135—140 сутак, то сёння будуем і здаём у эксплуатацыю за 45 сутак. Інтэнсіўнасць і тэхналагічнасць працы істотна павысіліся». Дзяніс Враб'ёў дадаў, што за апошнія гады атрыманы кратны прырост праходкі. «Тэмпы, якія мы сёння набралі, дазваляюць выходзіць на аб'ём здабычы нафты па гэтым годзе больш за два мільёны тон», — раскаў спецыяліст.

У планах «Беларуснафты» на гэты год — рэкордныя 300 тысяч метраў праходкі горных парод. Амаль трэць ад гэтага планавага паказчыка — практычна 100 тысяч метраў — па кірунку пошуку і разведкі. «Для падтрымання і росту ўзроўню здабычы нафты ў рэгіёне да 2030 года неабходна падтрымліваць бурэнне ў аб'ёмах да 340 тысяч метраў праходкі. У будучым дзякуючы атрыманым вынікам плануем адкрываць невялікія залежы, працаваць з цяжказдабывальнай нафтай. Ужо цяпер магу з упэўненасцю сказаць, што навукова абгрунтаваны прагноз дазваляе планаваць на 2030 год узровень здабычы нафты ў аб'ёме 2,3 млн тон», — падзяліўся планамі **намеснік генеральнага дырэктара па геалогіі «Беларуснафты» Пётр ПОЎЖЫК.**



Нафтаздабыча для Беларусі — галіна не новая. «Чорнае золата» на тэрыторыі нашай краіны здабываюць з 60-х гадоў мінулага стагоддзя. Самая багатая на гэты рэсурс — Гомельская вобласць. Гэта ўжо родны рэгіён для нашых нафтавікоў. Днямі яны запрасілі журналістаў у лагер сейсмаразведчыкаў у Рэчыцкім раёне. І, як расказаў Пётр Поўжык, цяпер праца сканцэнтравана на паўднёвых раёнах Гомельшчыны. На нядаўняй нарадзе ў Прэзідэнта было вырашана, што вывучаць гэтыя тэрыторыі «Беларуснафта» будзе сумесна з Міністэрствам прыроды і аховы навакольнага асяроддзя. «Вывучэнне паўднёвых тэрыторый Гомельскай вобласці можна лічыць нашым геалагічным шанцам для адкрыцця новых радовішчаў нафты і газу. У цяперашні час разам з Мінпрыроды мы распрацавалі збалансаваную схему ўзаемадзеяння. Наша кампанія будзе працаваць непасрэдна ў межах раней адкрытых радовішчаў Паўночнай структурна-тэктанічнай зоны і ўсходняй часткі Цэнтральнай структурна-тэктанічнай зоны, а прадпрыемствы Міністэрства — у межах заходняй часткі Цэнтральнай структурна-тэктанічнай зоны і ў Паўднёвай структурна-тэктанічнай зоне, якая ахоплівае тэрыторыі Ельскага, Лельчыцкага і Нараўлянскага раёнаў», — цытуе спецыяліста БелТА.

«Нафтавая ліхаманка» Беларусі, напэўна, не пагражае. Бо, нягледзячы на безумоўную важнасць і неабходнасць гэтага рэсурсу для нашай краіны, галоўнымі патрабаваннямі для гэтай дзейнасці застаюцца гаспадарскі падыход, апраўданыя распрацоўкі і суцэльная дысцыпліна.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# СТРАТЭГІЧНЫЯ ЗАДАЧЫ ДЗЕЛЯ ДАБРАБЫТУ БУДУЧЫХ ПАКАЛЕННЯЎ

## Менавіта так Беларусь разглядае захаванне прыродных рэсурсаў, мінімізацыю антрапагеннага ўздзеяння і змянення клімату

Аб гэтым заявіў Прэм'ер-міністр Беларусі Аляксандр ТУРЧЫН на пленарным пасяджэнні «Экалагічныя выклікі: на шляху да ўстойлівага развіцця» Міжнароднай экалагічнай канферэнцыі, якая адбылася на тэрыторыі курорта «Манжэрок» у Рэспубліцы Алтай.



Фота БелТА.

Аляксандр Турчын адзначыў, што павышаная сусветная ўвага да пытанняў аховы навакольнага асяроддзя і захавання экалагічнай чысціні планеты — не проста даніна модзе, а імкненне сфарміраваць трывалую мадэль устойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця.

«У Беларусі ахова навакольнага асяроддзя адносіцца да ключавых кірункаў дзяржаўнай палітыкі і мае комплексны характар. Яна закранае ўсе прыродныя кампаненты, экасістэмы, а таксама эканоміку, ахову здароўя, навуку, адукацыю і іншыя сферы дзейнасці дзяржавы і чалавека. У адпаведнасці з Канцэпцыяй нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь асноўнымі нацыянальнымі інтарэсамі ў экалагічнай сферы з'яўляюцца экалагічна арыентаванае сацыяльна-эканамічнае развіццё дзяржавы, захаванне спрыяльнага навакольнага асяроддзя і адаптацыя да змянення клімату», — абазначыў Аляксандр Турчын.

«Мы разглядаем захаванне прыродных рэсурсаў, мінімізацыю антрапагеннага ўздзеяння і змянення клімату як стратэгічныя задачы, ад якіх залежыць дабрабыт будучых пакаленняў», — падкрэсліў беларускі Прэм'ер, дадаўшы, што ў Беларусі прынцыпы зялёнай і цыркулярнай эканомік замацаваны на заканадаўчым узроўні ў Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2040 года, а таксама ў іншых праграмных дакументах доўгатэрміновага і сярэднетэрміновага планавання.

Асобна Прэм'ер-міністр спыніўся на праблеме ўключэння адходаў у другасны абарот. «Сёння ў рэспубліцы ўзровень выкарыстання адходаў вытворчасці (без уліку буйнатаннажных адходаў) складае каля 90 працэнтаў, цвёрдых камунальных адходаў — каля 40 працэнтаў», — расказаў Аляксандр Турчын.

Ён адзначыў, што ў маі 2025 года Прэзідэнтам Беларусі пастаўлена задача па фарміраванні цэласнай сістэмы кіравання ўсімі відамі адходаў і стварэнні аўтаматызаванай сістэмы ўліку аб'ёмаў утварэння адходаў, іх руху на ўсіх этапах — ад утварэння да выкарыстання.

«У бліжэйшы час у Рэспубліцы Беларусь будзе зацверджана стратэгія абыходжання з адходамі вытворчасці і спажывання ў краіне. Стратэгія стане асноўным дакументам, які комплексна вызначае мэту і перспектывы развіцця сістэмы абыходжання з адходамі, і будзе накіравана на фарміраванне эфектыўнай сістэмы абыходжання з адходамі з адзінай глабальнай мэтай — забеспячэнне да 2040 года ўзроўню выкарыстання адходаў вытворчасці і спажывання не менш як 90 працэнтаў», — падкрэсліў Прэм'ер-міністр.

Аляксандр Турчын адзначыў, што дзякуючы сістэмнай і мэтанакіраванай рабоце, цяпер у сусветным рэйтынгу па індэксе экалагічнай эфектыўнасці Беларусь займае 32-е месца са 180 краін свету. Ён таксама абазначыў, што работа вядзецца па ўсіх кірунках.

Нацыянальная палітыка ў галіне аховы і выкарыстання вод грунтуецца на прынцыпах паляпшэння экалагічнага стану паверхневых водных аб'ектаў і папярэджання іх забруджвання і вычэрпвання. «Рэспубліка Беларусь змагла забяспечыць эканамічны рост на фоне зніжэння спажывання водных рэсурсаў: аб'ёмы здабычы вод адносна 2000 года скараціліся на 24 працэнты», — расказаў Аляксандр Турчын. Ён дадаў, што ў выніку своечасовай рэканструкцыі і мадэрнізацыі камунальных ачышчальных збудаванняў скід недастаткова вычышчаных сцёкавых вод за апошнія 20 гадоў скараціўся ў 7,8 раза і цяпер не перавышае 0,2 працэнта ад агульнага аб'ёму сцёкавых вод, якія скідаюцца ў паверхневыя водныя аб'екты.

Таксама ў сваім выступленні Прэм'ер-міністр расказаў аб рабоце па забеспячэнні належнай якасці атмасфернага паветра. Маніторынг ажыццяўляецца ва ўсіх прамысловых гарадах краіны, сетка назіранняў пастаянна пашыраецца і ўдасканальваецца.

Яшчэ адна тэма, якую закрануў Аляксандр Турчын, — выкананне міжнародных кліматычных абавязацельстваў, у рамках якіх па Парыжскім пагадненні «беларускім бокам пастаўлена мэта — скараціць выкіды парніковых газаў да 2030 года на 35-40 працэнтаў адносна ўзроўню 1990 года. Цяпер гэты паказчык намі перавыкананы і ідзе работа па распрацоўцы новай, больш амбіцыйнай мэты па скарачэнні выкідаў».

Прэм'ер-міністр таксама расказаў, што ў Беларусі значна ўзрасло выкарыстанне аднаўляльных крыніц энергіі, такіх як ветра-, гідра- і сонечная энергія, дасягнуўшы 7,3 працэнта ў агульным аб'ёме цеплавой і электрычнай энергіі, якая пастаўляецца. Аляксандр Турчын таксама адзначыў, што ў Беларусі актыўна развіваецца электратранспарт. Колькасць легкавых электрамабіляў вырасла ў 3,4 раза за 2024 год. Расце і доля пасажырскага гарадскога электрычнага транспарту, якая сёння ў Мінску складае больш як 40 працэнтаў і працягвае расці.

Спыніўся спікер і на асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях, якія складаюць прыродны каркас нашай краіны. «Беларусь дасягнула адчувальных вынікаў і дэманструе істотны прагрэс у гэтым кірунку, асабліва за апошнія дзесяцігоддзе. Сістэма, якая існуе ў краіне, уключае 1355 асабліва ахоўных прыродных тэрыторый. У выніку планамернай работы ўстойліва расце плошча ахоўных прыродных тэрыторый, сёння яна складае 9,2 % тэрыторыі краіны», — расказаў Аляксандр Турчын.

«Дзякуючы сістэмнай і мэтанакіраванай працы цяпер у сусветным рэйтынгу па індэксе экалагічнай эфектыўнасці Беларусь займае 32-е месца са 180 краін свету. Рэспубліка Беларусь не будзе спыняцца на дасягнутым і прадоўжыць прыкладаць намаганні ў выкананні пастаўленых задач у галіне аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў», — рэзюмаваў беларускі Прэм'ер.

* * *

**На палях канферэнцыі Аляксандр Турчын правёў шэраг двухбаковых сустрэч.**

**Прэм'ер-міністр Беларусі сустрэўся з Прэм'ер-міністрам Узбекістана Абдулой Арыпавым.**

Як адзначыў Аляксандр Турчын, адносіны паміж Узбекістанам і Беларуссю развіваюцца даволі актыўна. У першую чаргу дзякуючы ўзаемаадносінам двух прэзідэнтаў, якія дабаўляюць паскарэнне рэалізацыі планаў у розных сферах супрацоўніцтва.

Прэм'ер-міністр таксама адзначыў высокую цікавасць да рэалізацыі розных праектаў з боку бізнесу. «Узровень нашага супрацоўніцтва і ў бягучым годзе рост тавараабароту паказваюць, што адносіны паміж нашымі краінамі рухаюцца па траекторыі, якая ўзыходзіць, і, магчыма, наспела неабходнасць падпісання дакумента аб стратэгічным партнёрстве паміж Узбекістанам і Беларуссю. Наш бізнес актыўна інвесціруе».

Аляксандр Турчын дадаў, што кампаніі з Беларусі гатовы супрацоўнічаць з Узбекістанам. Так як ёсць перспектыўныя напрамак, то, магчыма, неабходна «аказаць дапамогу нашаму бізнесу ў актывізацыі менавіта гэтых форм супрацоўніцтва», падкрэсліў кіраўнік беларускага ўрада.

Прэм'ер-міністр Узбекістана Абдула Арыпаў таксама пацвердзіў зацікаўленасць у актывізацыі супрацоўніцтва паміж краінамі.

**На палях экалагічнага форуму таксама адбылася сустрэча Аляксандра Турчына з кіраўніком Сбербанка Германам Грэфам, падчас якой былі абмеркаваны актуальныя пытанні супрацоўніцтва.**

**Паводле БелТА.**

ЖНІВО-2025

# ФІНАНСАВАЯ ПАДТРЫМКА, ГАРАЧАЕ ХАРЧАВАННЕ, ЗААХВОЧВАННЕ ПЕРАДАВІКОЎ

## Прафсаюзы ўключыліся ва ўборачную кампанію

На нядаўняй сустрэчы старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Юрыя СЯНЬКО з кіраўніком дзяржавы ішла размова ў тым ліку і аб удзеле прафсаюзных арганізацый ва ўборачнай кампаніі. Для паляпшэння ўмоў працы і быту работнікаў прафсаюзы аказваюць фінансавую і матэрыяльную падтрымку сельскагаспадарчым арганізацыям. Сродкі накіроўваюцца на закупку халадзільнікаў, пральных машын, мікрахвалевых печаў для абсталявання санітарна-бытавых памяшканняў, набыццё інвентару для арганізацыі харчавання працаўнікоў, аптэчак, танометраў, спецадзення і інш. І, вядома ж, — на заахвочванне перадавікоў вытворчасці.



Фота 1prof.by.

### АД КАМБАЙНЕРАЎ ДА КУХАРАЎ

Юрый Сянько расказаў, што летась у ходзе ўборачнай кампаніі было заахвочана 8,9 тысячы работнікаў.

— Ад камбайнераў да кухараў — усе ўдзельнікі, якія так ці інакш былі задзейнічаны ў жніве, на ўборцы ўраджаю. Пастараліся максімальна ахапіць усіх — і тых, хто прыгатаваў смачную ежу, і, безумоўна, тых, хто рабіў наш каравай больш важкім, — падкрэсліў старшыня Федэрацыі прафсаюзаў.

Сёлета таксама працягваецца традыцыйная работа па ўшанаванні найлепшых працаўнікоў жніва, у тым ліку маладзёжных, сямейных экіпажаў. У гэтым сезоне першым тысячнікам краіны стаў механізатар СВК «Гродзенскі» Сяргей Шантыр. Адметны вынік аграрый прадэманстраваў на ўборцы азімага ячменю, намалаціўшы запаветныя тоны за чатыры дні. Ураджайнасць культуры склала 105 цэнтнераў з гектара. Сяргей Шантыр працуе на прадпрыемстве 15 гадоў, а ў сельскай гаспадарцы — ужо чвэрць стагоддзя. За гэты час неаднаразова станавіўся перадавіком. Асабліва паспяховым стаў 2024 год — мужчыну ўшаноўвалі як шасцітысячніка. Тады ён завяршыў сезон на адзнацы, якая ўражвае, — 6,8 тысячы тон. І сёння механізатар настроены захаваць лідарскія пазіцыі, працуе, як заўсёды, з поўнай аддачай.

Передавіка жніва павіншавалі прадстаўнікі мясцовай улады, прафсаюза і кіраўніцтва гаспадаркі. Старшыня Гродзенскай абласной прафсаюзнай арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў АПК Міхаіл Сіцько адзначыў, што летась у рэгіёне было звыш 800 тысячнікаў, а гэта каля 70 % ад усяго парка камбайнаў, і выказаў надзею, што сёлета іх будзе яшчэ больш. Дарэчы, прынята рашэнне павялічыць памер узнагарод для пераможцаў спаборніцтва па ўборцы збожжавых і зернебабовых. Таксама ўзрасла і колькасць намінантаў.

### НА КАНТРОЛІ — АХОВА ПРАЦЫ

На пастаяннай аснове аказваецца дапамога наймальнікам у стварэнні бяспечных умоў працы. Прафсаюзы накіраваны на выяўленне патэнцыяльных вытворчых рызык, здольных прывесці да траўміравання работнікаў, і правядзенне прафілактычнай работы ў працоўных калектывах. Дзейнасць па прафілактыцы вытворчага траўматызму, якая праводзіцца з сацыяльнымі партнёрамі, дае свой плён. Адзначаецца зніжэнне колькасці няшчасных выпадкаў у галіне.

У прыватнасці, напярэдадні ўборачнай Федэрацыя прафсаюзаў сумесна з галіновым прафсаюзам работнікаў аграпрамысловага комплексу правяла рэспубліканскі семінар-нараду, дзе разглядаліся пытанні ўдасканалення работы па ахове працы, умацавання працоўнай і вытворчай дысцыпліны, стварэння ўмоў для высокапрадукцыйнай і бяспечнай працы ў сельгасарганізацыях. У цэнтры ўвагі прафсаюзаў падчас наведвання сельгаспрадпрыемстваў цяпер гатоўнасць сельгастэхнікі і зернесушыльных комплексаў да ўборачнай, выпуск тэхнікі на лінію, аснашчэнне санітарна-бытавых памяшканняў, правядзенне прыборнага кантролю вадзіцеляў транспартных сродкаў на прадмет алкагольнага ап'янення і ў цэлым кантроль стану здароўя аграрыяў, выкананне патрабаванняў супрацьпажарнай бяспекі.

— Зона нашай адказнасці — захаванне здароўя і жыцця чалавека, стварэнне добрых умоў працы, — падкрэсліў старшыня прафсаюза работнікаў АПК Васіль Хвацік, адзначыўшы, што сумесна з прафсаюзам аховы здароўя, міністэрствамі аховы здароўя і сельскай гаспадаркі прапрацавана гэта пытанне. — Цяпер прама на поле падчас абеду прыязджае ўрач або фельчар з ФАПа, каб ацаніць стан работнікаў, занятых на палявых работах, і своечасова аказаць дапамогу, а можа і выратаваць жыццё. Не толькі кантралюем іх самаадчуванне, але і нацэльваем на тое, каб працаўнікі мелі доступ да танометраў. Калі чалавеку стала дрэнна, каб ён мог памераць ціск і тут жа атрымаць медыцынскую дапамогу.

### РЭАГАВАЦЬ НЕАДКЛАДНА

Для аператыўнага рэагавання на праблемныя і спрэчныя сітуацыі, звязаныя з умовамі, аплатай працы ўдзельнікаў жніва, у Федэрацыі прафсаюзаў з пачатку ліпеня дзейнічае шматканальны тэлефонны нумар. Са жніўня ён будзе працаваць штодзень, без выхадных і свят, з 8.00 да 20.00. Прадстаўнікі прафсаюзаў гатовы неадкладна рэагаваць на ўсе пытанні працаўнікоў, занятых на ўборцы ўраджаю. Звароты прымаюцца па нумары 8 801 100 1111 (званок бясплатны для абанентаў «Белтэлекама» і мабільных аператараў (А1, МТС, БеСТ (Life).

— Прыём зваротаў вядзецца ў Міжгаліновым маніторынгавым цэнтры ФПБ, які дзейнічае з мая гэтага года. У перыяд уборачнай кампаніі асаблівая ўвага спецыялістаў цэнтра накіравана на аказанне дапамогі аграрыям, — расказалі ў прэс-службе ФПБ.

Забяспечанасць спецадзеннем і сродкамі індывідуальнай абароны, расцэнкі пры выкананні работ і аплата працы ў цэлым, арганізацыя харчавання, належныя санітарна-бытавыя ўмовы — па ўсіх гэтых і іншых пытаннях прафсаюзы гатовы аказаць неабходную падтрымку. У тым ліку пры неабходнасці будзе арганізаваны выезд спецыялістаў на месца для ўдакладнення сітуацыі.

Дарэчы, такая практыка ў прафсаюзах дзейнічае не ўпершыню, і яна даказала сваю эфектыўнасць. Летась пасля звароту працаўнікоў на гарачую лінію прафсаюзаў былі аператыўна вырашаны пытанні па паляпшэнні ўмоў працы, выплаце прэміяльных узнагарод і інш.

**Алена КРАВЕЦ.**

ПЯЦІГОДКА ЯКАСЦІ

# РАЦЫЯНАЛЬНЫЯ РАШЭННІ НА ЭКСПЕРТНЫМ УЗРОЎНІ

## У Беларусі будзе зарэгістравана Міжнародная асацыяцыя «Цэнтр падтрымкі якасці экспартнай прадукцыі»

Днямі ў сталіцы прайшло пасяджэнне ўстаноўчага сходу Міжнароднай асацыяцыі «Цэнтр падтрымкі якасці экспартнай прадукцыі». Асацыяцыя аб'ядноўвае спецыялістаў у галіне стандартызацыі, прамысловасці, навукі і бізнесу, адукацыі. Яе галоўная задача — дапамагаць прадпрыемствам замацоўвацца на замежных рынках: растлумачваць патрабаванні, знаёміць з неабходнымі працэдурамі, павышаць узровень даверу да беларускай прадукцыі. Цэнтр падтрымкі якасці экспартнай прадукцыі будзе займацца і пошукам аптымальных суадносін «цана — якасць», асабліва для ўсходніх рынкаў, дзе патрабаванні і плацежаздольнасць адрозніваюцца ад еўрапейскіх.



У будучыні да работы могуць далучыцца і іншыя краіны, напрыклад, Кітай, Індыя, В'етнам, Узбекістан. Мяркуецца, што ў такім фармаце можна будзе выпрацоўваць рашэнні, якія дазволяць прасоўваць прадукцыю без лішніх бар'ераў.

**Старшыня Дзяржстандарта Беларусі Алена МАРГУНОВА** адзначыла, што асацыяцыя стане экспертнай дыялогавай пляцоўкай паміж рознымі органамі і арганізацыямі: «У першую чаргу гэта дзяржстандарты Беларусі і Расіі, а таксама міністэрствы прамысловасці. І на гэтай дыялогавай пляцоўцы павінны абмяркоўвацца і выпрацоўвацца прапановы па пытаннях абароны ўнутранага рынку, зняцця бар'ераў пры пастаўках прадукцыі, а таксама ўнясення змяненняў у заканадаўства».

Цяпер у межах Саюзнай дзяржавы актыўна прапрацоўваецца пытанне аб стварэнні тэхнічнага камітэта па стандартызацыі і якасці. «Чакаецца, што асацыяцыя дапоўніць яго дзейнасць у межах «двойкі» для развіцця інфраструктуры якасці нашых краін у адпаведнасці з сённяшнімі рэаліямі, развіццём экспартных кірункаў, а таксама сучасным тэхнічным узроўнем і кампетэнцыямі», — патлумачыла Алена Маргунова.

**Кіраўніком Міжнароднай асацыяцыі «Цэнтр падтрымкі якасці экспартнай прадукцыі»** падчас пасяджэння быў абраны **Віктар НАЗАРАНКА**. Паводле яго слоў, стварэнне асацыяцыі звязана з неабходнасцю пашыраць экспартныя магчымасці дзвюх краін — Беларусі і Расіі: «Тэма якасці не мае меж. Беларусь і Расія працуюць у цеснай звязцы. І ўсе нашы поспехі — сумесныя. Трэба стварыць такую асацыяцыю. Таму што важна выпрацоўваць рацыянальныя рашэнні на экспертным узроўні. І гэтыя рашэнні павінны датычыцца ўсіх пытанняў, звязаных з пашырэннем нашых экспартных магчымасцяў. Таксама важна вырашаць задачы, звязаныя са зняццем гандлёвых бар'ераў. Часта прадпрыемствам складана зарыентавацца ў патрабаваннях і правілах пэўных краін. І гэтымі пытаннямі будзе займацца асацыяцыя».

**Дырэктар Дзяржаўнага рэгіянальнага цэнтра стандартызацыі, метралогіі і выпрабаванняў у Пскоўскай вобласці Аляксандр БАРКОЎ** упэўнены, што стварэнне асацыяцыі дазволіць больш эфектыўна прасоўваць прадукцыю вытворцаў Беларусі і Расіі на экспарт: «Выхад на знешнія рынкі перш за ўсё звязаны з пытаннямі якасці і яе пацвярджэннем. І тыя інструменты, якія асацыяцыя можа даць, дазволяць у тым ліку і прадпрыемствам Пскоўскай вобласці працаваць на экспарт. Такая сумесная работа, я думаю, будзе карыснай. Гэта важная недзяржаўная пляцоўка для экспертнай работы і дапамогі нашым прадпрыемствам у прасоўванні прадукцыі ў іншыя краіны. Беларускі бок заўсёды адрозніваўся высокімі кампетэнцыямі ў гэтай сферы».

**Яна ВАЛАСАЧ.**

# ПАДТРЫМКА НА СТАРЦЕ ПРАФЕСІЙНАЙ КАР'ЕРЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Пачну з таго, што сёлета істотна павялічыўся набор у ВНУ на бюджэтныя месцы на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, — паведаміў ён. — Гэта зроблена, каб забяспечыць кадрамі медыцыну, сельскую гаспадарку, адукацыю. Такі кірунак прадугледжвае трохбаковы дагавор — паміж абітурыентам, ВНУ і арганізацыяй, якая плаціць грошы за адукацыю і куды выпускнік прыйдзе працаваць. Вядома, такі абітурыент мае пэўныя прэферэнцыі — яму трэба здаць толькі адзін унутраны экзамен па профільным прадмеце. Але ж ёсць і абавязкі: пасля заканчэння вучобы ён павінен адпрацаваць на прадпрыемстве-заказчыку пяць гадоў. Дарэчы, у тых, хто вучыўся на платнай аснове, няма абавязковага размеркавання, але яны могуць паклапаціцца аб гэтым самі, загадзя напісаўшы адпаведную заяву аб уключэнні іх у спіс размеркавання.



Дэпутат падкрэсліў, што з 1 верасня паводле новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі ўводзіцца абавязак арганізацыі — заказчыка кадраў кампенсаваць сродкі, затрачаныя дзяржавай на падрыхтоўку спецыялістаў у выпадку неабгрунтаванага скасавання або невыканання ўмоў дагавора аб мэтавай падрыхтоўцы.



Фота БелТА.

## ХТО ЁСЦЬ ХТО?

Першае тлумачэнне, якое дае МіхаілМіронЧык, датычыцца статусу маладога спецыяліста: хто і на якой падставе яго атрымлівае.

— Згодна з Кодэксам аб адукацыі маладымі спецыялістамі лічацца выпускнікі, якія працуюць па размеркаванні на працягу тэрміну абавязковай работы па размеркаванні. Сюды ж адносяцца выпускнікі, накіраваныя на работу ў адпаведнасці з дагаворам аб падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, дагаворам аб мэтавай падрыхтоўцы — на працягу тэрміну абавязковай работы. У гэтай катэгорыі і выпускнікі, якія працуюць па пераразмеркаванні. Маладыя спецыялісты прымаюцца на пасады ў адпаведнасці са спецыяльнасцю і кваліфікацыяй, якія яны атрымалі ва ўстанове адукацыі і якія пазначаны ў пасведчанні аб накіраванні на работу.

## ІСТОТНАЯ ДАПАМОГА

— Наймальнік абавязаны забяспечыць маладога спецыяліста работай, якая адпавядае атрыманай спецыяльнасці і кваліфікацыі, афарміць па бестэрміновым працоўным дагаворы або кантракце, — расказаў парламентарый. — Маладому работніку нельга ўстанаўліваць выпрабавальны тэрмін і на працягу адпрацоўкі ён абаронены ад звальнення. Таксама недапушчальна скасоўваць з ім працоўны дагавор з-за неадпаведнасці пасадзе, што ён займае, або рабоце, якую выконвае, з прычыны недастатковай кваліфікацыі.

Маладым спецыялістам, якія скончылі ўстановы сярэдняй спецыяльнай або вышэйшай адукацыі і прыбылі на работу па размеркаванні, выплачваецца грашовая дапамога ў памеры месячнай стыпендыі, прызначанай у апошнім семестры навучання.

— Тым, хто скончыў прафесійна-тэхнічны каледж, дапамога выплачваецца з разліку тарыфнай стаўкі па прысвоенай ім кваліфікацыі (разрадзе, класе, катэгорыі) або адпаведнага акладу. Калі маладыя спецыялісты і выпускнікі не атрымлівалі стыпендыю ў апошнім перад выпускам семестры, ім выплачваюць адпаведную грашовую дапамогу з разліку сацыяльнай стыпендыі, устаноўленай на дату выпуску. Даведку аб яе памеры ўстанова адукацыі выдае пры ўручэнні дакумента аб адукацыі, — зазначыў парламентарый.

## АДПАЧЫНАК

— Адпачынак у тых, каго накіравалі па размеркаванні або па дагаворы мэтавай падрыхтоўкі, складае 31 каляндарны дзень, а ў выпускнікоў, накіраваных у якасці педагагічных работнікаў, — 45 дзён, — тлумачыць Міхаіл Міронічык. — Права на адпачынак рэалізуецца адразу пасля заканчэння навучання, гэта значыць да моманту працаўладкавання выпускніка. Важны момант — прадастаўленне адпачынку маладым спецыялістам не рэгулюецца заканадаўствам аб працы, бо ён даецца да афармлення на работу.




Крыніца інфаграфікі sb.by

## ПРЫХОДЗЬЦЕ ЗАЎТРА...

— Здараюцца, на жаль, і такія сітуацыі, калі заказчыкі кадраў не маюць магчымасці працаўладкаваць заяўленых раней выпускнікоў, — расказвае дэпутат Палаты прадстаўнікоў. — У такіх форс-мажорных выпадках арганізацыя павінна паведаміць пра гэта ўстанове адукацыі не пазней чым за 2 месяцы да пачатку размеркавання. Зазначу, што падобныя сітуацыі бываюць нячаста. А ўвогуле, неабгрунтаваная адмова ў заключэнні працоўнага дагавора забаронена працоўным заканадаўствам. Арганізацыі і прадпрыемствы не маюць права адмовіць маладым людзям, якія прыбылі на работу па накіраванні і па размеркаванні пасля заяршэння навучання ў дзяржаўнай установе адукацыі. Між іншым, ад абавязковай адпрацоўкі можна і адмовіцца па ўласнай ініцыятыве, але ў такім выпадку прыйдзецца пакрыць сродкі за навучанне.

Парламентарый дадаў, што згодна з Кодэксам дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў (з ліку выпускнікоў), вызваляюцца ад пакрыцця затрачаных сродкаў пры немагчымасці прадастаўлення ім новага месца работы пры пераразмеркаванні ў населеных пунктах па месцы жыхарства або па месцы ўключэння іх у спісы ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

## ЗВОЛЬНІЦЬ НЕЛЬГА ПАКІНУЦЬ

— Звальненне маладога спецыяліста — выпадак рэдкі, але пра гэты важны нюанс варта ведаць, — гаворыць парламентарый. — Так, нельга яго звольніць па пагадненні бакоў. Аднак працоўныя адносіны могуць быць спынены ў выпадку паступлення на дзённае навучанне для атрымання адукацыі больш высокага ўзроўню, пераходу на выбарную пасаду, пераразмеркавання, ліквідацыі арганізацыі, скарачэння колькасці або штата работнікаў. Падставай таксама могуць паслужыць неадпаведнасць займанай пасадзе па стане здароўя або пэўныя дысцыплінарныя правінасці — прагул, ужыванне спіртных напояў на працоўным месцы і іншыя. Звальненне магчыма і пры парушэнні наймальнікам заканадаўства аб працы, калектыўнага або працоўнага дагавораў. Напрыклад, пры несвоечасовай выплаце зарплаты, рабоце без выхадных і іншых.

## АТЫ-БАТЫ...

— Яшчэ адна сітуацыя — выпускнік, які атрымаў пасведчанне аб накіраванні на работу, прызваны на службу ва Узброеныя Сілы да названага ў пасведчанні аб накіраванні на работу тэрміну прыбыцця ў арганізацыю, — расказвае Міхаіл Міронычык. — У такім выпадку ён паведамляе аб гэтым установе адукацыі і наймальніку. Калі малады спецыяліст прызваны на ваенную службу ў перыяд абавязковай адпрацоўкі, то яго звальненне ажыццяўляецца па агульных падставах у адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 44 Працоўнага кодэкса, у якім гаворыцца аб спыненні працоўнага дагавора ў сувязі з прызывам работніка на ваенную службу. Гэта азначае, што работнік, які атрымаў павестку аб прызыве на ваенную службу, мае права звольніцца. За 2 месяцы да заканчэння тэрміну службы ён пісьмова паведамляе наймальніку аб прыбыцці або неприбыцці для працаўладкавання пасля заканчэння тэрміну службы. Прызваны на службу ва Узброеныя Сілы да або пасля працаўладкавання выпускнік-мэтавік пасля заканчэння службы абавязаны дапрацаваць вызначаны дагаворам тэрмін абавязковай работы.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

**Дарэчы**

## БЕЛАРУСКАЯ ПАРТЫЯ «БЕЛАЯ РУСЬ» СТВАРАЕ МАЛАДЗЁЖНЫ РУХ «ІСКРА»

**Такое рашэнне прынята на пасяджэнні Вышэйшага палітычнага савета партыі, якое прайшло ўчора ў Нацыянальнай бібліятэцы.**

Па словах **старшыні партыі Вольгі ЧАМАДАНАВАЙ,** такая ініцыятыва паступіла ад моладзі. Яна цікавая сама па сабе і адрозніваецца ад тых маладзёжных кірункаў, якія ўжо ёсць у краіне.

— Гэта не савет, не грамадскае аб'яднанне, а выключна партыйны маладзёжны рух. Думаю, гэта будзе новы палітычны фармат. Я бачу, што ў шэрагі партыі моладзь гатова ўступаць, гатова працаваць, — сказала Вольга Чамаданава.

**Прадстаўнік моладзі Іван КВАШКО** пацвердзіў карэспандэнту БелТА, што ідэю вылучыла новае пакаленне Беларускай партыі «Белая Русь».

— Мяркуецца, што рух будзе рэалізоўваць прыкладныя задачы па фарміраванні кадравага рэзерву і правядзенні экспертна-аналітычнай работы для развіцця і прасоўвання праграмы Беларускай партыі «Белая Русь» у маладзёжным асяроддзі. І адзін з ідэйных пачаткаў — мы зыходзім з таго, што з іскры разгарыцца полымя, — растлумачыў ён.

На пасяджэнне Вышэйшага палітычнага савета партыі было вынесена сем пытанняў, у тым ліку падпісана пагадненне паміж Беларускай партыяй «Белая Русь» і РДГА «Беларускае таварыства «Веды».

«Мы маем намер на працягу года правесці па ўсёй краіне палітычны праект «Адкрытыя веды», які ўжо быў апрабаваны ў Мінску. Гэта інфармацыйная кампанія, у якой будуць браць удзел не толькі лідары партыі «Белая Русь», але і дэпутаты, эксперты, палітолагі», — адзначыла Вольга Чамаданава.

На пасяджэнні таксама быў выбраны прэзідыум Беларускай партыі «Белая Русь», разгледжаны пытанні штатнага раскладу партыі і шэраг іншых.

ЖАЛЕЗНАЕ БРАТЭРСТВА

# НА ХУТКАСНАЙ ТРАЕКТОРЫІ

## Як развіваецца беларуска-кітайскае стратэгічнае партнёрства




Кітай нязменна разглядае адносіны з Беларуссю са стратэгічнай вышыні і з доўгатэрміновай перспектывай. Аб гэтым заявіў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітая ў Беларусі Чжан Вэньчуань падчас брыфінгу ў пасольстве КНР у Мінску.

### ТРЫВАЛЫ ФУНДАМЕНТ

«Пад стратэгічным кіраўніцтвам Старшыні КНР Сі Цзіньпіна і Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі кітайска-беларускія адносіны выйшлі на хуткасную траекторыю развіцця, дасягнуўшы гістарычна найвышэйшага ўзроўню і стаўшы ўзорам узаемнай павагі, даверу і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва паміж дзяржавамі, — падкрэсліў Чжан Вэньчуань. — Апошнім часам кітайска-беларускія адносіны дэманструюць мноства яркіх момантаў, практычнае супрацоўніцтва прыносіць багаты плён, асаблівы характар кітайска-беларускага ўсепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства становіцца ўсё больш відавочным».

Як адзначыў кіраўнік дыпламатычнай місіі, лідары дзвюх краін наладзілі выдатныя рабочыя адносіны і асабістае сяброўства, заклаўшы трывалы палітычны фундамент для двухбаковых кантактаў і вызначаючы вектар развіцця кітайска-беларускага супрацоўніцтва з высокай ступенню палітычнай мудрасці і стратэгічнай рашучасці.

«Аляксандр Лукашэнка — адзін з лідараў замежных дзяржаў, якія найбольш часта наведвалі Кітай. Прэзідэнт Беларусі прыняў удзел у многіх буйных дыпламатычных мерапрыемствах, арганізаваных Кітаем, — падкрэсліў Чжан Вэньчуань. — Гэта ў поўнай меры дэманструе асаблівую ўвагу, якую абодва бакі надаюць кітайска-беларускаму ўзаемадзеянню, і наглядна адлюстроўвае высокі ўзровень і ўнікальнасць двухбаковых адносін».

### ІНВЕСТЫЦЫІ І ЛІЧБАВЫЯ КАЛІДОРЫ

«Лета сёлета ў Мінску выдалася неспякотным, аднак адносіны паміж Кітаем і Беларуссю, асабліва кантакты на высокім узроўні і супрацоўніцтва ў розных сферах, літаральна «кіпяць», — заўважыў Чжан Вэньчуань. — Практычнае ўзаемадзеянне дэманструе дынамічнае развіццё з выхадам на перспектыўна новыя кірункі».

Як паведаміла саветнік пасольства КНР Ван Жуйцзюань, сёлета за першае паўгоддзе аб'ём двухбаковага тавараабароту перавысіў $4 млрд, што на 3,8 % больш, чым за аналагічны леташні перыяд. У канцы мая ў Мінску падчас шостага пасяджэння кітайска-беларускага міжурадавага камітэта па супрацоўніцтве бакі падпісалі пратакол пасяджэння і дакументы аб супрацоўніцтве ў сферы лічбавай эканомікі, навукі і тэхналогій, а таксама дасягнулі пагаднення аб стварэнні новай камісіі па прамысловым супрацоўніцтве.

Як адзначыў саветнік пасольства КНР Ся Гуаньюань, Беларусь з яе багатай гісторыка-культурнай спадчынай і цудоўнай прыродай уяўляе вялікую цікавасць для кітайскіх турыстаў. Па меркаванні дыпламата, нам неабходна засяродзіцца на паглыбленні супрацоўніцтва ў галіне лічбавага турызму. Напрыклад, сумесна ствараць праекты ў сферы воблачных тэхналогій, такіх як музеі віртуальнай рэальнасці і лічбавых калідоры культурнай спадчыны, якія дазволяць зацікавіць патэнцыяльных турыстаў і закласці аснову для будучых рэальных падарожжаў.

### СЯМ'Я НА ТРОХ КАНТЫНЕНТАХ

Апошні год стаў насамрэч знакавым у развіцці Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Як вядома, летась 4 ліпеня падчас саміту ў Астане Беларусь стала паўнаважкім членам ШАС. Сімвалічна, што на гэтым жа форуме да Кітая перайшло старшынства ў арганізацыі. Як заўважыў саветнік пасольства КНР Янь Фэн, цяпер «вялікая сям'я ШАС» аб'ядноўвае 26 дзяржаў на трох кантынентах, стаўшы самай маштабнай па тэрыторыі і колькасці насельніцтва рэгіянальнай міжнароднай арганізацыяй у сучасным свеце і ўзорам новай мадэлі шматбаковага супрацоўніцтва. «Як дзяржавы — члены ШАС, нашы краіны актыўна ўдзельнічаюць у рабоце арганізацыі, сумесна ладзяць важныя мерапрыемствы, уключаючы саміт кіраўнікоў дзяржаў, і падтрымліваюць цесны дыялог па ключавых пытаннях развіцця ШАС і рэгіянальнай бяспекі, уносячы важкі ўклад у прасоўванне «Шанхайскага духу», — адзначыў Чжан Вэньчуань.

З 31 жніўня да 1 верасня ў Цяньцзіні адбудзецца саміт ШАС, на якім чакаецца ўдзел лідараў больш як 20 дзяржаў і 10 міжнародных арганізацый. А 3 верасня ў Пекіне на плошчы Цяньаньмэнь урачыста пройдуць памятны сход і парад з нагоды 80-годдзя Перамогі кітайскага народа ў Вайне супраціўлення японскім захопнікам і заканчэння Другой сусветнай вайны. Як вядома, у гэтых гістарычных мерапрыемствах па асабістым запрашэнні Старшыні КНР Сі Цзіньпіна возьме ўдзел Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Як падкрэсліў пасол КНР, нашы краіны гатовы разам адстойваць сапраўдную гістарычную праўду аб Другой сусветнай вайне і цвёрда абараняць пасляваенны міжнародны парадак. «Цаной неймаверных ахвяр і перажытых нягод мы абаранілі святыя панацыі незалежнасці, суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці, а таму асабліва востра ўсведамляем сапраўдную цану мірнага неба над галавой, — канстатаваў Чжан Вэньчуань. — І сёння, праз 80 гадоў, аднапалярны свет, гегемонія, запалохванне і цкаванне працягваюць наносіць велізарную шкоду. Чалавецтва зноў апынулася на ростанях, дзе вырашаецца: выбраць шлях адзінства ці расколу, дыялогу ці канфрантацыі, узаемнай выгады ці гульні з нулявой сумай».

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**


## О реализации имущества СООО «МЯСОПРОДУКТ»

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | ООО «АсистБанкрот», УНП 693326101, тел. +37544 7945248 |
| **Продавец** | СООО «МЯСОПРОДУКТ», УНП 800016744, тел. +375333070212 |
| **Форма, дата, время и место проведения торгов** | Торги в форме открытого аукциона **27.08.2025 в 12.00,** г. Минск, ул. Скрыганова, 6/1-9, оф. 301 |

**Сведения о предмете проведения торгов**

**Лот № 1 (все одним лотом):**
производственное оборудование и инвентарь согласно списку, размещенному на сайте организатора https://likvid.by.
По вопросу ознакомления с предметом торгов, дополнительной информации обращаться
по моб. тел.: +375333070212, +375447945248

**Начальная цена предмета торгов:** Лот № 1 – **89930,40** бел. руб. с НДС по ставке 20 %.
**Местонахождение предмета торгов:**
Минская область, Столбцовский район, Старосверженский с/с, д. Скоморошки, ул. Восточная, 15/1, 15/2

**Порядок проведения торгов**

Шаг аукциона – 5 %. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявки на участие в них только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Размер задатка, сроки приема заявлений и порядок зачисления задатка**

Задаток в сумме 10 % от стоимости предмета торгов перечисляется в срок по **05.08.2025** на р/с BY86UNBS30122537200000000933 в ЗАО «БСБ Банк», г. Минск, код UNBS BY2X, получатель – ООО «АсистБанкрот», УНП 693326101, назначение платежа – задаток за участие в аукционе. Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в торгах.
Прием заявлений с приложением документов осуществляется с 09.00 26.07.2025 по 16.00 26.08.2025 заказной корреспонденцией по адресу: ООО «АсистБанкрот» (220079, г. Минск, а/я 148) либо по e-mail: asistbankrot@gmail.com.
**Совместно с заявлением на участие в торгах предоставляется:**
**Юридическими лицами – резидентам Республики Беларусь** – копии устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), свидетельства о государственной регистрации и их подлинники, доверенность представителя юридического лица или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица.
**Юридическим лицом, иной организацией – нерезидентом Республики Беларусь** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юридического лица, иной организации или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
**Индивидуальным предпринимателем** – резидентом Республики Беларусь – копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона.
**Индивидуальным предпринимателем – нерезидентом Республики Беларусь** – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
**Представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя – резидента Республики Беларусь** – нотариально удостоверенная доверенность;
**Представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя** – нерезидента Республики Беларусь – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию, которая заверяется организатором торгов

**Срок подписания договора и срок оплаты приобретенного предмета торгов:**
Срок подписания договора – 3 банковских дня с момента утверждения протокола об итогах торгов.
Срок оплаты приобретенного предмета торгов – 3 банковских дня от даты заключения договора

| | |
|---|---|
| **Возмещение затрат** | Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, а также оплатить вознаграждение Организатору торгов в размере 1,5 % от окончательной цены продажи предмета торгов в течение 3 банковских дня со дня проведения торгов |
| **Документы, необходимые для участия в торгах** | Заявка на участие в торгах, платежный документ о перечислении задатка; документ, подтверждающий полномочия на участие в торгах |



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона / оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Агат-электромеханический завод», 220114, г. Минск, пр-т Независимости, 115, каб. 317 |

**Предмет электронных торгов: оборудование (бывшее в употреблении), расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 115 (территория предприятия)**

| Лот № | Инв. номер | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 43376528 | Прибор для использования электрической прочности УПУ-10 | 1968,00 |
| 2 | 43376527 | Прибор для использования электрической прочности УПУ-10 | 1968,00 |
| 3 | 43306039 | Универсальная пробойная установка УПУ-1М | 1128,00 |
| 4 | 42308072 | Горизонтально-фрезерный станок 6Р-82 | 2148,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется участником электронных торгов в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **10 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 08.07.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов:**
**06.08.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **05.08.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33, +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

# НАДЗЕЙНА І БЕСПЕРАБОЙНА

## ПАЛІВА ЎЖО НАРЫХТАВАНА, ПАЛОВА КАЦЕЛЬНЯЎ АДРАМАНТАВАНА

У Беларусі стартавала работа па афармленні пашпартоў гатоўнасці да ацяпляльнага сезона. Пры падрыхтоўцы аб'ектаў ЖКГ да работы ў наступны зімовы перыяд Міністэрствам жыллёва-камунальнай гаспадаркі ажыццяўляецца штодзённы кантроль па 13 асноўных паказчыках. Сярод іх — замена і капітальны рамонт катлоў, замена цеплавых сетак, стварэнне запасаў драўнянага паліва, прафілактычны рамонт сетак ацяплення жылых дамоў, цеплавых пунктаў, рамонт стыкаў, даху.

Што датычыцца штомесячнага кантролю, ён праводзіцца па 89 паказчыках — гэта работы па выпрабаванні абсталявання кацельняў, цеплавых сетак, прафілактычным аглядзе водаправодных і каналізацыйных сетак, збудаванняў на іх, рамонту электраабсталявання жылых дамоў, печаў, паверкі прыбораў уліку і гэтак далей. Усе гэтыя работы гарантуюць надзейнае, бесперабойнае, безаварыйнае цяпло і водазабеспячэнне жыллёвага фонду.

Па стане на сёння пачата работа па афармленні пашпартоў гатоўнасці. Аб гэтым расказаў **начальнік упраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксей ФІЛАНОВІЧ**. Іх атрымалі ўжо каля 420 цеплакрыніц. Выкананы работы па нарыхтоўцы парадку 1,5 млн шчыльных кубічных метраў драўнянага паліва — гэта ўжо 95 %. Нарыхтавалі паліўнага мазуту тры тысячы тон — гэта 98 %. Заменена 146 км цеплавых сетак, што складае 57 % ад запланаваных аб'ёмаў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Цяперашнім часам ажыццяўляюцца і праведзены работы па выпрабаванні і прафілактычным рамонце абсталявання каля дзвюх тысяч кацельняў, што складае 58 % ад запланаванага аб'ёму, а таксама 7,7 тысячы км цеплавых сетак — крыху больш за 50 %. На ўзроўні 46 % ад плана выкананы прафілактычны рамонт цэнтральных цеплавых пунктаў, а кацельняў — 54 %. На аб'ектах водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі здзейснена перакладка 245 км сетак водазабеспячэння — 80 % ад запланаванага аб'ёму. Было перакладзена таксама 60 км сетак каналізацыі — гэта парадку 50 %. Выкананы прафілактычныя рамонты сістэм ацяплення ў 28 тысячах дамоў, што складае 66 % ад плана.**

Усе работы на дадзены момант вядуцца ў адпаведнасці з зацверджанымі графікамі. Сярэдні працэнт выканання фізічных работ складае звыш 50 %, а дзесьці дасягае нават 70—80 %. Поўная гатоўнасць аб'ектаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі краіны да работы ў асенне-зімовы перыяд будзе забяспечана ў запланаваныя тэрміны.

## ЭНЕРГЕТЫКІ З ЗАДАЧАМІ СПРАЎЛЯЮЦЦА

Амаль палова работ па рамонце цепла- і электратэхнічнага абсталявання ўжо выканана ў рамках падрыхтоўкі да зімы. Пра гэта расказаў **намеснік галоўнага інжынера дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Белэнерга» Аляксандр МІХНЮК**.

На 2025 год запланавана выкананне капітальнага рамонту 21 энергетычнага катла, 18 турбін, 10 воданагравальных і 7 паравых катлоў. У цяперашні час цалкам завершаны рамонт 20 адзінак абсталявання, яшчэ 18 знаходзяцца ў рабоце.

На 52 адзінках цеплатэхнічнага асначэння запланаваны сярэдні рамонт. З іх завершана ўладкаванне 17 адзінак, 18 — у працэсе выканання. Таксама ў планах рамонт 35 дымавых комінаў і 33 газаходаў. Ужо завершаны рамонт 28 аб'ектаў, яшчэ 29 знаходзяцца ў рабоце.

Актыўна праводзіцца і рамонт электратэхнічнай часткі. Капрамонту падлягаюць 18 генератараў, 2 сілавыя трансфарматары, 17 высакавольтных выключальнікаў, а таксама 166 падстанцый. На сёння завершаны работы на 38 адзінках абсталявання, на 115 — працягваюцца.

Праведзены капітальны рамонт ліній электраперадачы ўсіх класаў напружання агульнай працягласцю больш за 9,6 тысячы км, што складае каля 46 % ад гадавога плана. Па замене апор выканана больш за 55 %.

**Завершана расчыстка прасек паветраных ліній на плошчы больш за 9,5 тысячы гектараў, што складае каля 57 % ад плана. Сумесна з лясгасамі наведзены парадак на ўчастках паблізу прасек працягласцю 753 км. Акрамя таго, у гарадах абласнога і раённага падпарадкавання, а таксама ў Мінску заменена 90 км кабельных ліній.**

У межах падрыхтоўкі да асенне-зімовага перыяду сфарміраваны аварыйна-аднаўленчыя і аператыўна-выязныя брыгады. Яны цалкам укамплектаваны сродкамі аховы і неабходнымі матэрыяламі.

На балансе энергазабеспячальных арганізацый — 234 перасоўныя дызельныя электрастанцыі. Адпрацаваны парадак дзеяння аператыўных груп пры надзвычайных сітуацыях і ва ўмовах нізкіх тэмператур. Акрамя таго, рэгулярна праводзяцца супрацьаварыйныя трэніроўкі і інструктажы персаналу.

## ГАЗАПРАВОДЫ ПАДЛЯГАЮЦЬ ДЫЯГНОСТЫЦЫ

**Начальнік упраўлення па фарміраванні навуковай палітыкі ў галіне газазабеспячэння і забеспячэнні агульных відаў дзейнасці дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Белпаліўгаз» Аляксандр БЕЛКІН** расказаў, што для бесперабойнага забеспячэння насельніцтва паліўна-энергетычнымі рэсурсамі кампанія рыхтуе свае арганізацыі да ўстойлівай работы ў асенне-зімовы перыяд. «У адпаведнасці з зацверджанымі графікамі рэалізуюцца арганізацыйна-тэхнічныя мерапрыемствы, якія забяспечваюць устойлівае, надзейнае паліва- і энергазабеспячэнне народнай гаспадаркі і насельніцтва ў асенне-зімовы перыяд, які мае адбыцца».

Ужо выканана планавае тэхнічнае абследаванне працягласцю больш за 4 тысячы км газаправодаў, праведзена тэхнічная дыягностыка больш за 400 км падземных газаправодаў, замена больш за 66 тысяч адзінак маральна састарэлага бытавога газавага абсталявання. Арганізацыямі «Белпаліўгаза» здабыта больш за 770 тысяч тон торфу, выраблена больш за 380 тысяч тон брыкетаў і тарфяной сушонкі.

Нагадаем, што жыхарам трэба і самім клапаціцца пра своечасовую замену газавыкарыстоўвальнага абсталявання. Для гэтага дастаткова звярнуцца ў раённы або гарадскі цэнтр абслугоўвання насельніцтва газазабеспячальнай арганізацыі і атрымаць увесь комплекс паслуг па замене бытавога газавага абсталявання. Неабходна таксама правяраць тэхнічны стан і надзейнасць дымавых і вентыляцыйных каналаў.

**Яна ВАЛАСАЧ.**




**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**
**СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ НА 70 %**

| | |
|---|---|
| **Организатор** | **ЗАО «Оценка Сервис», г. Гомель, ул. Лепешинского, 1** |
| **Продавец** | **ОАО «Труд», г. Гомель, ул. Советская, д. 39** |

**Аукцион состоится 08.08.2025 в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28.
**Заявления на участие и необходимые документы, в т. ч. перечисление задатка, принимаются с 9.00 28.07.2025 по 06.08.2025 до 16.00** по указанному адресу.
**Организатор аукционных торгов: ☎ 8 (0232) 51-22-17, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89.**
**E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**

**Предмет аукциона:**
**ЛОТ № 1. Два изолированных помещения** (складское помещение с инв. № 350/D-246855, пл. **962,4 кв. м**, производственное помещение с инв. № 350/D-246852, пл. **330,5 кв. м, два капитальных строения (склад (ангар)** с инв. № 350/С-181548, пл. **521,0 кв. м,** здание административно-хозяйственное с инв. № 350/С-161164, пл. **26,0 кв. м, тепловая сеть** протяженность – **213,6 м, водопроводная сеть** протяженность – **89,4 м, канализационная сеть** протяженность – **149,2 м). В состав лота входят:** ворота металлические (инв. № 12) 8,60 м, дорога асфальтированная (инв. № 029) 101 кв. м, забор деревянный с воротами (запасной вход) (инв. № 08) 157 кв. м, забор с воротами (инв. № 026), 132 м, навес (инв. № 09), яблоня /30 (инв. № 9026), яблоня /35 (инв. № 9022), яблоня /35 (инв. № 9023), яблоня /38 (инв. № 9024), яблоня /41 (инв. № 9020), яблоня /44 (инв. № 9021), яблоня /44 (инв. № 9025).
Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Мозырская, 2Б/1/2.
**Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000006000452** общей площадью **1,3847 га.**
**Право постоянного пользования (доля в праве 1/1).**
**Целевое назначение земельного участка:** для эксплуатации производственных зданий.
Подробный перечень изолированных помещений, капитальных строений, входящих в состав лота, размещен на сайте организатора аукциона **https://ocenkaservis.by (раздел «Очные торги»).**
**Начальная цена с учетом НДС 20 %: 275 625,00 бел. руб.**

Задаток **5 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с **Продавца (ОАО «Труд»):** р/с BY11BLBB30120400062954001001 Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, БИК BLBBBY2X, УНП 400062954, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса»

Размер шага составляет **5 (пять) процентов** от начальной цены лота

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | В рабочие дни по предварительному согласованию **8 (044) 551-22-67** Пастарнаков Никита |

Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; оплатить **вознаграждение организатору в размере 4 % от цены продажи лота** в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **30 (тридцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона. **Условия оплаты: оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента его подписания.** Проводится аукцион в соответствии с Положением закрытого акционерного общества «Оценка Сервис» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).
Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 30.04.2025 г.
Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены на сайте Организатора торгов: **https://ocenkaservis.by (раздел «Очные торги»), Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база»**

**Организатор аукционных торгов: ☎ 8 (0232)51-22-17, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89.**
**E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, пл. Базарная, д. 13. УНП 691522554 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**) |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Склад – 829,5 кв. м** (инв. № 640/С-59617). Адрес: **Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, пер. Железнодорожный 3-й, 12** | |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,1973** га, предоставлен на праве аренды (срок действия по 24.05.2030) для содержания и обслуживания здания склада | |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 261 600,00 бел. руб.** | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **30 (тридцати**) календарных дней после подписания договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 4 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов | |
| Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 05.06.2025 | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 27.08.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 26.08.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| **Контактные телефоны: +375 17-310-36-37, +375 (29) 154-34-35; auction@cpo.by** | |



## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона по продаже пустующих жилых домов

**Организатор:**
Задорьевский сельский исполнительный комитет Логойского района Минской области

**Дата, время и место проведения аукциона:**
27 августа 2025 г. в 11.00 по адресу: Логойский район, аг. Задорье, ул. Центральная, д. 5, Задорьевский сельисполком,
конт. тел.: (801774) 75 3 35, 75 3 83, (+37544) 7892553.
Эл. адрес: zadorye@logoysk.gov.by

| | |
|---|---|
| **Адрес пустующего жилого дома** | **Минская обл., Логойский р-н, д. Красное, д. 10** |
| **Характеристика пустующего жилого дома** | Одноквартирный одноэтажный жилой дом бревенчатый, общая площадь: 65 кв. м, печное отопление, крыша – шифер, не зарегистрирован в РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» |
| **Земельный участок** | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, не зарегистрирован в РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» |
| **Начальная цена** | 1 базовая величина |
| **Сумма задатка** | 20 % от начальной цены. Задаток перечисляется на расчетный счет BY30AKBB36006190311010000000 в ОАО АСБ «Беларусбанк», код AKBBBY2X, УНП 600537220, код платежа 04805. Получатель – Задорьевский сельисполком |
| **Начало и окончание приема документов** | С даты объявления аукциона до 22 августа 2025 года (включительно), с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |

Аукцион проводится в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» и Положением о порядке продажи без проведения аукционов пустующих жилых домов, организации и проведения аукционов по их продаже, утвержденному постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.09.2021 № 547.

Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также юридические лица, если иное не установлено законодательными актами и международными договорами Республики Беларусь.

**Для участия в аукционе необходимо**:
1. подать заявление об участии в аукционе по установленной форме;
2. предоставить квитанцию об оплате суммы задатка;
3. предоставить паспорт и копию его страниц, содержащих идентификационные сведения, либо нотариально удостоверенную доверенность;
4. заключить соглашение с местным исполнительным комитетом о правах, обязанностях и ответственности сторон.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с пустующим жилым домом на местности.

**Условия**: Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление ему пустующего дома в частную собственность с внесением платы за пустующий дом в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 %, обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона или признания аукциона несостоявшимся:

внести плату за предмет аукциона и возместить затраты на организацию и проведение аукциона;

подать заявление о предоставлении земельного участка;

после принятия соответствующего решения – обратиться в Логойское бюро РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка и жилого дома.


# ЯКІЯ МЫ?

## Адносіны да асаблівых дзяцей як люстэрка грамадства

Пра маральны стан чалавечай супольнасці можна судзіць па розных крытэрыях, але ёсць у іх агульнае — адносіны да тых, каму патрэбна дапамога: старыя, дзеці, інваліды... Увага, накіраваная не толькі на сябе, але і на іншых, сведчыць пра духоўнае здароўе як асобна ўзятага чалавека, так і грамадства ў цэлым. Факт: у Беларусі за апошнія гады больш як у шэсць разоў павялічылася колькасць дзяцей-інвалідаў, уладкаваных у замяшчальныя сем'і. Нягледзячы на тое што хлопчыкаў і дзяўчат, якія ўпершыню прызнаныя інвалідамі, становіцца больш (адзін з фактараў — дасягненні медыцыны, якія дазваляюць захаваць жыцці ў складаных выпадках), колькасць маленькіх насельнікаў інтэрнатных устаноў змяншаецца. І гэта сведчыць пра тое, што мы становімся лепш.




Фота ЮНІСЕФ у Беларусі.

### СПАЧАТКУ — НЕ ДАПУСЦІЦЬ СТРАТЫ СЯМ'І

Такая тэндэнцыя — вынік каласальнай работы і дзяржавы, і недзяржаўных інстытутаў. Часта нельга падзяліць намаганні вялізнай колькасці самых розных людзей і арганізацый, якія дзесяцігоддзямі намагаюцца змяніць стаўленне соцыуму да інвалідаў. Сюды ўваходзіць усё: стварэнне безбар'ернага асяроддзя, інклюзія, сацыяльная абарона, дзяржаўная палітыка, інфармаванасць насельніцтва.

**Галоўны ўрач Віцебскага абласнога спецыялізаванага дома дзіцяці Алена МІЗЕРКІНА** — той чалавек, які ўвачавідкі назірае, як змяняецца свядомасць беларусаў.

— Цяпер ёсць катэгорыя ўсынавіцеляў і прыёмных бацькоў, якія не баяцца браць дзяцей з устаноўленай інваліднасцю, — кажа яна. — Яны добра разумеюць, што гэта няпросты шлях, бо такія члены сям'і патрабуюць значна больш часу і выдаткаў, асаблівых умоў. Дарослыя асэнсоўваюць, што іх далейшае жыццё будзе падстройвацца пад патрэбы асаблівага дзіцяці.

Але перш чым паўстане пытанне аб уладкаванні дзіця-інваліда ў сям'ю, праводзіцца тытанічная работа, каб такую сітуацыю не дапусціць. Віцебскі абласны спецыялізаваны дом дзіцяці ўдзельнічае ў маштабным гуманітарным праекце «Папярэджанне інстытуцыяналізацыі і дэінстытуцыяналізацыя дзяцей ранняга ўзросту і дзяцей з інваліднасцю ў Віцебскай вобласці», які рэалізуецца пры падтрымцы Дзіцячага Фонду ААН (ЮНІСЕФ) у Рэспубліцы Беларусь. Праект вырас з праграмы «Сям'я кожнаму дзіцяці», якая цягам чатырох гадоў рэалізоўвалася ў Гомельскай вобласці — так пашыраецца яго геаграфія. На Віцебшчыне ініцыятыва ўзнікла ў 2022 годзе. Першапачаткова яна была разлічаная на два гады. Летась атрымала працяг яшчэ на два.

— Прафілактыка інстытуцыяналізацыі — гэта папярэджанне сітуацыі, калі дзіця аказваецца ў інтэрнатнай установе. Дэінстытуцыяналізацыя — знаходжанне выхаванцу такой установы новай сям'і, — тлумачыць Алена Мізеркіна і дадае: — Гэта тое, чым мы займаемся. Я толькі што пазнаёміла з дзяўчынкай кандыдатаў ва ўсынавіцелі. Учора дваіх хлопчыкаў вярнулі ў біялагічную сям'ю. Адзін з нядаўніх выпадкаў усынаўлення — дзіця мела парок сэрца, было абследавана і рыхтавалася да аперацыі. Кандыдаты былі праінфармаваныя пра ўсе, звязаныя з гэтым, нюансы і тым не менш прынялі рашэнне малое забіраць.

### СІНЕРГЕТЫЧНЫ ЭФЕКТ

Галоўны ўрач Дома дзіцяці звяртае ўвагу: у Беларусі на заканадаўчым узроўні прадугледжана прыярытэтнасць сямейнага выхавання дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Гуманітарны праект дазваляе сканцэнтраваць намаганні спецыялістаў на дапамозе як біялагічным бацькам, так і апекунам.

— Праект міжведамасны, — звяртае ўвагу на другую яго асаблівасць **дырэктар Віцебскага абласнога цэнтра карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі Марынэ ФЁДАРАВА**. — Ён рэалізуецца ўстановамі адукацыі, сацыяльнай абароны і аховы здароўя дзевяці раёнаў Віцебскай вобласці і горада Віцебска (Віцебскі, Докшыцкі, Лепельскі, Аршанскі, Полацкі, Сенненскі раёны і Чыгуначны, Кастрычніцкі і Першамайскі — абласнога цэнтра), горада Наваполацка, а таксама Багушэўскім дзіцячым сацыяльным пансіянатам «Прамяністы».

Згодна з данымі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, летась у Беларусі 5 183 дзіцяці былі ўпершыню прызнаныя інвалідамі. Гэта на тысячу больш, чым у 2020-м. Аднак колькасць дзяцей-інвалідаў у дзіцячых інтэрнатных установах за той жа перыяд зменшылася на некалькі соцень (летась іх было каля 1,5 тысячы ва ўстановах усіх тыпаў). Значыць малыя выхоўваюцца ў родных сем'ях. Гэта вынік у тым ліку дзяржаўных гарантый і падтрымкі спецыялістаў.

— Калі нараджаецца дзіця з цяжкай паталогіяй або калі яму пастаўлены дыягназ, сям'я перажывае стрэс. Бацькам трэба зразумець, як далей жыць, і на гэтым этапе падключаюцца ўсе: медыкі, педагогі, сацыяльныя работнікі, — кажа галоўны ўрач Віцебскага абласнога спецыялізаванага дома дзіцяці. — Такая міжведамасная работа ажыццяўляецца не толькі ў рамках праекта, але заўсёды. Спецыялісты сістэм аховы здароўя, адукацыі і сацыяльнай абароны камунікуюць паміж сабой. Сям'і даецца ўся неабходная інфармацыя.

— Дзякуючы падтрымцы ЮНІСЕФ і Прыёрбанка мы навучаем спецыялістаў для вызначэння новых форм падтрымкі і кансультуем сем'і, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, — звярнула ўвагу Марынэ Фёдарава. — Вызначаем такія сем'і, аналізуем іх патрэбы. Выбудоўваем індывідуальную работу з кожнай. У выніку пашыраецца спектр паслуг, якія аказваюць такім сем'ям установы адукацыі, аховы здароўя і сацыяльнага абслугоўвання.

Дзеці, якія маюць патрэбу ў паліятыўнай дапамозе, атрымліваюць яе на базе Віцебскага абласнога спецыялізаванага дома дзіцяці.

— Мы гутарым з бацькамі яшчэ ў лякарні, працягваем працаваць з імі, калі дзіця паступае да нас. Часта стан немаўляткі паляпшаецца: дзякуючы праведзеным аперацыям, адаптацыі яго арганізма. Прыстасоўваюцца і бацькі. Мы іх навучаем догляду за цяжкахворым малым, суправаджаем і надалей, — дадае Алена Мізеркіна.

Паступова ў праект увайшлі дзеці не толькі з паталогіяй, але і тыя, хто аказаўся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Напрыклад, калі інваліднасць або псіхафізічную асаблівасць мае нехта з членаў сям'і, калі сям'я па розных прычынах аказваецца ў сацыяльна небяспечным становішчы.

**ДА ВЕДАМА:**

▶ У Беларусі каля 16 тысяч дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. З іх на выхаванні ў замяшчальных сем'ях (апякунскія і прыёмныя), а таксама ў дзіцячых дамах сямейнага тыпу знаходзіцца больш як 12,8 тысячы дзяцей, гэта значыць больш за 80 працэнтаў.

▶ У Віцебскай вобласці пражывае 2282 дзіцяці, якія маюць статус сіраты, у тым ліку і дзеці з інваліднасцю. 948 дзяцей выхоўваюцца ў апякунскіх сем'ях, 539 — у прыёмных, 228 — у дзіцячых дамах сямейнага тыпу.



Фота sb.by

### ПРАВА НА ДАМАШНЯЕ ЦЯПЛО

Алена Мізеркіна правяла для журналіста «Звязды» невялікую экскурсію па Доме дзіцяці і яго тэрыторыі. Галоўнае ўражанне — усмешкі. Усміхаюцца персанал і выхаванцы, малыя цягнуць да дарослых ручкі, і ў кожным пакоі ў супрацоўнікаў на руках дзіця. Гэта невыпадкова.

— Калі нягледзячы на ўсю праведзеную работу дзіця трапляе да нас, наша задача як у рамках заканадаўства, так і ў рамках праекта знайсці яму новую сям'ю, — каментуе Алена Мізеркіна. — У залежнасці ад статуса дзіцяці гэта можа быць апека, усынаўленне або прыёмныя бацькі. Дапамагаем дзіцяці справіцца з псіхатраўмай, пераадолець сацыяльную дэпрывацыю, сацыялізавацца. У нас працуюць вельмі добрыя дэфектолагі, выдатныя медыкі, маецца добрая лячэбная база. Праводзім усе рэабілітацыйныя мерапрыемствы, каб дзіця, калі да яго прыходзяць дарослыя, пайшло на кантакт.

Яшчэ адно ўражанне ад Віцебскага абласнога спецыялізаванага дома дзіцяці — утульнасць. Гэта датычыцца і вялікай зялёнай тэрыторыі, і прадуманага інтэр'ера, уключаючы роспіс калідораў віцебскімі студэнтамі-мастакамі і галерэю партрэтаў выхаванцаў.

**СА ЖНІЎНЯ ВЫРАСТУЦЬ ДАПАМОГІ НА ДЗЯЦЕЙ**

**У Беларусі з 1 жніўня павялічаць памер некаторых сацыяльных выплат, паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.**

У прыватнасці, дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў павялічацца на 8,2 %, зыходзячы з сярэднямесячнага заробку работнікаў у нашай краіне за II квартал. Нагадаем, гэты паказчык за чэрвень склаў 2717,8 рубля.

Такім чынам, выплаты на першае дзіця складуць 931,91 рубля (рост на 70,49 рубля). Гэта 35 % ад сярэднямесячнай заработнай платы за II квартал. На другое і наступных дзяцей выплачваюць 40 %. Выплата павялічыцца да 1065,04 рубля (плюс 80,56 рубля). На дзіця-інваліда дапамога складае 45 % і ўзнімецца да 1198,17 рубля (павелічэнне на 90,63 рубля).

Такі памер дапамог будзе дзейнічаць з 1 жніўня 2025-га да 31 студзеня 2026 года-га.

Сярод набыткаў у рамках праекта — лялька-мадэль нованароджанага дзіцяці, на якой адпрацоўваюцца навыкі догляду і некаторыя медыцынскія маніпуляцыі. У планах — набыць педыятрычныя лялькі, на якіх можна навучыць бацькоў даглядаць дзяцей з трахеастомамі і гастрастомамі. Яшчэ адна неабходная навінка спецыялізаванага дома дзіцяці — платформенныя вагі, на іх можна ўзважваць малое на калясцы.

Віцебскаму абласному цэнтру карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі ў рамках праекта было перададзена абсталяванне для мабільнага рэсурснага пакоя: камунікатары, лупы, трэнажоры, вертыкалізатары і гульнявыя наборы. Спецыялісты навучаюць бацькоў з аддаленых населеных пунктаў карыстацца гэтым аснашчэннем.

За перыяд рэалізацыі праекта (2024-ы і першая палова 2025-га) 117 дзяцей выведзены з інтэрнатных устаноў. Сёлета, за першыя шэсць месяцаў, былі вызначаны 30 сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей з інваліднасцю або з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў Віцебскай вобласці і знаходзяцца ў цяжкой жыццёвай сітуацыі або ў сацыяльна небяспечным становішчы. З кожнай працуюць так званыя кейс-менеджары. У выніку дзве сем'і выведзеныя з сацыяльна-небяспечнага стану. Работа з астатнімі працягваецца.

За першае паўгоддзе 2025 года з Віцебскага абласнога спецыялізаванага дома дзіцяці вярнуліся ў сем'і 25 % дзяцей, усыноўлены — 39 %, аддадзены пад апеку — 16 %, у прыёмныя сем'і — 4,5 %, у дзіцячыя дамы сямейнага тыпу — 2,3 %.

У Багушэўскім сацыяльным пансіянаце з пачатку года вызначаны 11 сем'яў (біялагічныя, апякунскія і прыёмныя), у якія могуць быць вернутыя дзеці. Адно з іх ужо дома.

На Віцебшчыне праведзена анкетаванне 1000 сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей з інваліднасцю. Яны ацанілі якасць паслуг у сферы адукацыі, медыцыны і сацыяльнай абароны. Вывучана патрэба такіх сем'яў у прафесійным бэбісіцінгу — паслузе па доўгачасовым доглядзе за дзецьмі кваліфікаваным спецыялістам. У рамках гуманітарнага праекта гэты сэрвіс будзе апрабаваны ў Аршанскім раёне, для чаго закуплены сацыяльныя і медыцынскія рэабілітацыйныя наборы. Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Аршанскага раёна — каардынатар праекта ад сацыяльнай абароны — плануе не толькі выпрацаваць, але і выпрабаваць дзейныя механізмы сацыяльнага абслугоўвання сем'яў у Віцебскай вобласці для наступнай перадачы станоўчага вопыту на іншыя рэгіёны краіны.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

***P.S. «Як вам нашы дзеці? — спытала мяне на развітанне Алена Мізеркіна і вочы яе напоўніліся пяшчотай. — Праўда, прыгожыя? Да нас едуць з усёй краіны і кажуць: у вас самыя прыгожыя!» Гэта сапраўды так.***



Фота sb.by



Фота аўтара.



Фота аўтара.


## ДОПОЛНЕНИЯ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «НикаПроект»,

*опубликованной в газете «Звязда» от 26.02.2021 г.*

по объекту: «Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями на пересечении ул. Прилукской – ул. Глаголева – пр. Жукова в г. Минске», 3-я очередь строительства 3–7-я секции

Застройщик:
Общество с ограниченной ответственностью «НикаПроект», зарегистрированное в ЕГР 22.03.2011 за № 191581623.

Местонахождение: г. Минск, ул. М. Богдановича, д. 155, оф. 810, тел. +375 29 647 70 00.

**Характеристика объекта строительства:** Проектной документацией предусматривается строительство встроенного нежилого помещения общей площадью 99,98 кв. м, расположенного в 7-й секции на 3-м нежилом этаже, с обособленным входом непосредственно с улицы со стороны пр. Жукова с уровня земли.

Высота помещения составляет 2,85 метра. Встроенное помещение изолировано от жилой части дома глухими стенами и перегородками. Окна и входные двери витражные из алюминиевых профилей с заполнением стеклопакетами. В качестве наружной отделки стен применяются навесной «вентилируемый фасад» с применением керамогранитных плит. Проектом предусмотрено создание безбарьерной среды, а также благоустройство территории в границах работ 3-й очереди.

**Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается офисное помещение по цене за 1 кв. м, эквивалентной 2000 долларов США.**

**Характеристика объекта строительства:** Проектной документацией предусматривается строительство встроенного нежилого помещения общей площадью 21,81 кв. м, расположенного в 7-й секции на 3-м нежилом этаже, с обособленным входом непосредственно с улицы со стороны пр. Жукова с уровня земли.

Высота помещения составляет 2,85 метра. Встроенное помещение изолировано от жилой части дома глухими стенами и перегородками. Окна и входные двери витражные из алюминиевых профилей с заполнением стеклопакетами. В качестве наружной отделки стен применяются навесной «вентилируемый фасад» с применением керамогранитных плит. Проектом предусмотрено создание безбарьерной среды, а также благоустройство территории в границах работ 3-й очереди.

**Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается офисное помещение по цене за 1 кв. м, эквивалентной 2500 долларов США.**

**Характеристика объекта строительства:** Проектной документацией предусматривается строительство встроенного нежилого помещения общей площадью 134,87 кв. м, расположенного в 7-й секции на 2-м нежилом этаже, с обособленным входом непосредственно с улицы со стороны пр. Жукова.

Высота помещений составляет 3,05 метра. Встроенные помещения изолированы от жилой части дома глухими стенами и перегородками. Окна и входные двери витражные из алюминиевых профилей с заполнением стеклопакетами. В качестве наружной отделки стен применяются навесной «вентилируемый фасад» с применением керамогранитных плит. Проектом предусмотрено создание безбарьерной среды, а также благоустройство территории в границах работ 3-й очереди.

**Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается офисное помещение по цене за 1 кв. м, эквивалентной 2200 долларов США.**

Встроенные помещения передаются с черновой внутренней отделкой: штукатурка стен, стяжка пола. Система отопления встроенных помещений выполняется отдельно от системы отопления жилого дома, с установкой индивидуального прибора учета тепла. Отопление водяное, предусмотрена разводка, отопительные приборы. Система вентиляции встроенных помещений – приточно-вытяжная механическая и частичная естественная вентиляция (приток) с механической вытяжкой. Водоснабжение встроенных помещений – от отдельной системы водопровода низкого давления с установкой индивидуальных приборов учета потребляемой воды, предусмотрены установка и подключение унитазов

Электроснабжение: предусмотрена установка вводно-распределительных щитков. От каждого вводно-распределительного щитка предусмотрено подключение оптического модема, системы вентиляции, щитка пожарной сигнализации, дополнительно предусмотрен резерв.

Общая суммарная выделенная электрическая мощность на помещения общественного назначения составляет 220 кВт. Проектом предусмотрена техническая возможность подключения потребителей 5-20 кВт в зависимости от площади помещения и его функционального назначения. Связь и сигнализация: установка оптического распределительного устройства для предоставления услуг связи РУП «Белтелеком». Встроенные помещения оборудуются автономной неадресной системой пожарной сигнализации и системой оповещения с выводом на пульт диспетчеризации МЧС. По соглашению сторон отдельные виды работ могут не выполняться.

**Условия оплаты:**

- при условии единовременной оплаты стоимости объекта долевого строительства расчет должен быть произведен дольщиком в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном органе. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа. По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости помещения;

- при условии оплаты стоимости объекта долевого строительства согласно графику платежей к договору создания объекта долевого строительства первоначальный взнос по жилому помещению составляет 50 % от стоимости объекта долевого строительства. Оплата первоначального взноса должна быть произведена дольщиком в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном органе. Оставшаяся сумма по договору оплачивается ежемесячно равными долями в соответствии с графиком платежей к договору создания объекта долевого строительства;

- при кредитовании оплата стоимости объекта долевого строительства производится единовременно в полном объёме стоимости объекта. Оплата должна быть произведена дольщиком в течение 25 (двадцати пяти) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном органе.

УНП 191581623

ЖЫЦЦЁ

# ДВА БЕРАГІ АДНОЙ РАКІ

**У гэтай сям'і армянская мова гучыць штодзённа. Вера і Мікалай Дайнэкі лічаць: іх дзеці — Нэлі, Арцём, Абрам — жывучы ў Беларусі, павінны ведаць мову, гісторыю, культуру мамінай радзімы.**

## У ПОШУКАХ НОВАГА ДОМА

Сям'я Аруцюнян прыехала ў нашу краіну пасля Спітакскага землятрусу, які здарыўся ў снежні 1988 года і закрануў Эчміядзінскі раён, дзе жылі Карапет Абрамавіч, Лідзія Тадэвосаўна і пяцёра іх дзяцей. Далёкую Беларусь для перасялення галава сям'і абраў па парадзе былога таварыша па службе ў арміі.

Апынуўшыся ў Дзяржынскім раёне, Карапет Абрамавіч уладкаваўся ў калгас кіроўцам-кранаўшчыкам. Альберт, Раман і Вера пайшлі ў школу, малодшы Давід — у дзіцячы садок. Пазней з Арменіі прыляцяць з мужам і старэйшая Марынэ.

— Спачатку ў Беларусі нам было вельмі нялёгка, — успамінае Вера Дайнэка. — У школе выкладалі на беларускай мове. Я тады не ведала нават рускай. У чацвёртым класе пачынала навучанне з нуля...

Але паступова ўсе члены сям'і Аруцюнян вучылі мову, асвойваліся, жыццё наладжвалася. А калі нарэшце з інтэрната яны пераехалі ў свой дом у Залессі, адчулі сапраўднае шчасце.

Да заканчэння школы Вера дагнала па паспяховасці сваіх беларускіх аднагодкаў і паступіла на факультэт статыстыкі ў БДЭУ.

## СПАТКАННЕ — ТОЛЬКІ ПАСЛЯ ДАЗВОЛУ БАЦЬКІ

Здавалася б, дзяўчынка-армянка будзе імкнуцца да шлюбу выключна з суайчыннікам. Але ў кожнага свой лёс.

— Сам я з Фаніпаля, усіх Аруцюнянаў сустракаў і ў горадзе, і ў самім Залессі, дзе жыла мая бабуля, — расказвае Мікалай Дайнэка. — Аднойчы з прыяцелем зайшлі ў кавярню, там за столікам сядзела Вера, і Андрэй, сябар, прывітаўся з ёй.

Як аказалася, яго маці і Вера працавалі разам у банку, ён часта купляў у яе латарэйныя білеты. Пасля той сустрэчы ў кавярні хлопец вырашыў асабіста пазнаёміцца з дзяўчынай. Зайшоў у банк і прапанаваў Веры сустрэцца, пагуляць.

— Мне было ўжо 25 гадоў, але бацька забараняў без яго ведама кудысьці хадзіць, тым больш з хлопцамі, — успамінае Вера. — Я так і сказала Мікалаю: «Трэба прыйсці да майго таты і папрасіць, каб ён дазволіў мне ісці з табой на спатканне. Ты павінен паабяцаць, што своечасова прывядзеш мяне дадому».

— Спачатку я падумаў, што Вера жартуе, — прызнаецца Мікалай. — Але аказалася — не, усё на поўным сур'ёзе. Памятаю, упершыню размаўляючы з Карапетам Абрамавічам, адчуваў сябе трохі напружана. З першага ж спаткання мне спадабалася, як Вера паводзіла сябе — сціпла, з годнасцю. Не хаваю: было крыху страшна ісці ў сям'ю з іншай культурай, адносінамі, традыцыямі. Але я хацеў ажаніцца раз і на ўсё жыццё, і інтуіцыя падказвала: з Верай на гэта можна спадзявацца. Не стаў зацягваць — праз паўгода зрабіў ёй прапанову рукі і сэрца.



## ПАБУДАВАЦЬ ДОМ, АДНОСІНЫ, БІЗНЕС

Сям'я Дайнэкаў жыве ва ўтульным доме з вялікай кухняй, агародам і садам, дзе растуць яблыкі і абрыкосы. У Веры і Мікалая трое дзяцей: 18-гадовая Нэлі, 16-гадовы Арцём, 7-гадовы Абрам. Сёння муж і жонка займаюцца бізнесам па продажы матэрыялаў і абсталявання для шынамантажу.

Адносіны, дом, дастатак Мікалай і Вера будавалі паступова, дзень за днём. Не ўсё атрымлася адразу, але яны праявілі зайздросныя ўпартасць і цярпенне.

— Я заўсёды марыў працаваць разам з жонкай, — адзначае Мікалай. — Калі па выслузе гадоў сышоў з МНС, стаў пераконваць яе ў неабходнасці заняцца бізнесам. У Веры для гэтага ёсць усё — эканамічная адукацыя, камерцыйная жылка, уменне размаўляць з людзьмі. Я быў упэўнены: гэты «капітал» абавязкова павінен прынесці дывідэнды.

Вера спачатку супраціўлялася: толькі нарадзілася трэцяе дзіця, яна планавала больш часу ўдзяляць Абраму. Але пад напорам мужа ўрэшце здалася і пачала «раскручваць» сямейную справу.

А Мікалай пайшоў у дэкрэтны водпуск па доглядзе маленькага сына. І хоць гэта быў ва ўсіх адносінах новы для мужчыны досвед, ён здолеў. Абрам аказаўся спакойным хлопчыкам, да таго ж пры неабходнасці на выручку заўсёды прыходзіла Лідзія Тадэвосаўна.

## ВЕДАЦЬ СВАЕ КАРАНІ

Нэлі сёлета скончыла Фаніпальскую гімназію імя А. І. Гурына. 16-гадовы Арцём і 7-гадовы Абрам працягваюць там вучыцца. Ніхто з траіх дзяцей ні разу не сутыкаўся з праявамі нядобразычлівасці з боку аднагодкаў.

Усе трое вывучаюць матчыну мову, размаўляюць па-армянску.

— Ніякіх рознагалоссяў на гэты конт у мяне з Мікалаем не было, — падкрэслівае Вера. — Мы абое перакананыя: дзеці павінны ўмець падтрымліваць адносіны не толькі са сваякамі, але і з любым суайчыннікам-армянінам, адчуваць сябе носьбітамі не толькі беларускай, але і армянскай культуры.

Трэба чуць, з якім пачуццём 18-гадовая Нэлі чытае ўласныя вершы на армянскай мове, бачыць, як тэмпераментна яна і Абрам выконваюць армянскія танцы. Абрам на любым свяце — тамада, душа кампаніі. Ён любіць гатаваць разам з мамай смачныя стравы. Арцём аддае перавагу спорту: захапляецца футболам, тэнісам.

У вольны час сям'я Дайнэкаў любіць падарожнічаць па Беларусі, рэгулярна наведвае Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур, штогод адпачывае ў Арменіі. За 18 гадоў сумеснага жыцця нават Мікалай стаў разумець армянскую мову і шмат што палюбіў у культуры, традыцыях і кухні гэтага народа.

Мы сядзім за шчодрым, смачным сталом, размаўляем. Высвятляецца, што Нэлі хоча быць медыкам. Арцём і Абрам пакуль не вызначыліся з выбарам прафесіі. Усім траім падабаецца ў Беларусі, з ёй яны звязваюць сваю будучыню. Але і Арменія ім вельмі дарагая. Усе трое задаволены, што ў іх столькі сваякоў і сяброў — беларусаў і армян, што на іх стале бываюць і дранікі, і далма, што яны ўмеюць размаўляць і па-беларуску, і па-армянску. Галоўнае, чаго хочуць іх бацькі, — каб яны сябравалі паміж сабой, і ў выніку злучэння дзвюх культур сталі духоўна багацейшымі.

**Вольга ПАКЛОНСКАЯ.**

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**


## ДОПОЛНЕНИЕ И ИЗМЕНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ

по объекту «Возведение многоквартирного жилого дома по ул. Каролинской в г. Минске»,

*опубликованной в газете «Звязда» от 03.05.2025 № 85 (30473)*

**Застройщик:** коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» зарегистрировано Мингорисполкомом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 05.01.2015 за № 192400611.

**Юридический адрес и местонахождение предприятия:** 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, 4-107, тел./факс (017) 234-16-99.

**Офис продаж:** 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, 6, офис 213, тел.: (017) 234 16 98, (044) 795 44 44, (044) 559 33 91.

**Режим работы офиса продаж:** понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15, обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.

**Цель строительства –** строительство многоквартирного жилого дома по ул. Каролинской в г. Минске.

**Сведения об этапах и сроках строительства:**

Срок начала строительства жилого дома – июль 2024 года.

Нормативная продолжительность строительства – 23 месяца.

Предполагаемый срок завершения застройщиком строительства жилого дома и ввода его в эксплуатацию – 3-й квартал 2026 года.

Лоджии в двухкомнатных квартирах – алюминиевый профиль, за исключением квартир общей площадью 59,87 кв. м, расположенных на 3–14 этажах, и общей площадью 59,63 кв. м, расположенных на 15–24 этажах.

Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам для заключения договоров создания объектов долевого строительства дополнительно предлагаются 72 квартиры без выполнения внутренних отделочных работ на 5–6, 9–10 этажах, в том числе:

– 48 однокомнатных квартир общей площадью от 34,54 до 34,89 кв. м;

– 24 двухкомнатные квартиры общей площадью от 59,87 до 62,29 кв. м.

**Стоимость 1 кв. м общей площади квартиры для заключения договоров**

| Квартиры | Площадь квартиры, кв. м | Стоимость 1 кв. м общей площади квартиры, бел. руб. | Стоимость 1 кв. м общей площади кладового помещения, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **3–4 этажи** | | | 3 000 |
| 1-комнатные (квартиры № 4–9, 22–23, 26–27) | 34,54–34,58 | 4 800 | |
| 1-комнатные (квартиры № 13–18, 31–32, 34–36) окна во двор | 34,54–34,89 | 4 400 | |
| 2-комнатные (квартиры № 2–3, 10–11, 21, 28) | 59,87–60,04 | 4 400 | |
| 2-комнатные (квартиры № 1, 12, 30) окна во двор | 62,29 | 4 200 | |
| **5–10 этажи** | | | |
| 1-комнатные (квартиры № 40–45, 58–63, 112–117, 130–135) | 34,54–34,58 | 5 500 | |
| 1-комнатные (квартиры № 49–54, 67–72, 88, 121–126, 139–144) окна во двор | 34,54–34,89 | 5 300 | |
| 2-комнатные (квартиры № 38–39, 46–47, 56–57, 64–65, 110–111, 118–119, 128–129, 136–137) | 59,87–60,04 | 4 900 | |
| 2-комнатные (квартиры № 37, 55, 109, 127) окна во двор | 62,29 | 4 700 | |
| 2-комнатные (квартиры № 48, 66, 84, 120, 138) окна во двор | 62,29 | 4 500 | |

**Договор создания объекта долевого строительства отдельно на кладовое помещение не заключается.**

**Условия оплаты**:

первоначальный взнос в размере **30 % стоимости** объекта долевого строительства в течение **10 (десяти) календарных дней** со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма – ежемесячно до конца строительства в соответствии с графиком платежей к договору создания объекта долевого строительства.

**При условии 100 % оплаты цены договора в течение 10 календарных дней с даты регистрации договора в Мингорисполкоме на 10 (Десять) квартир, расположенных на 5–10 этажах действует акция со снижением стоимости 1 кв. метра общей площади квартиры на 300 рублей.**

**Документы** для заключения договоров создания объектов долевого строительства **будут приниматься и регистрироваться в ходе личного приема и в порядке живой очереди с 8.30 31.07.2025 года** до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего задекларированному количеству объектов долевого строительства, **по адресу: г. Минск, ул. С. Есенина, д. 6, офис 213 (офис продаж).**

**Для подачи заявления и заключения договора необходимо наличие:**

для физических лиц – паспорта (биометрического документа, удостоверяющего личность); доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке;

